Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

22 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 12 (26125)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

МЕЦЬ ПРЫГОЖУЮ СКУРУ — ВАЛОДАЦЬ УДАЧАЙ

Дэрматолага мы запрасілі на «прамую лінію». У ёй возьме ўдзел урач-дэрматавенеролаг загадчык амбулаторнага дэрматавенералагічнага аддзялення Мінскага скурвендыспансэра Уладзімір Іванавіч ЯРОМІЧ. **«Прамая лінія»** адбудзецца **24 студзеня** ў чацвер **з 15.00 да 16.30**. Тэлефануйце: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

ДА 1 ЛЮТАГА ПРАЕКТ УКАЗА «АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАННЯХ ДОЛЕВАГА БУДАЎНІЦТВА» ПАВІНЕН БЫЦЬ ДАПРАЦАВАНЫ

Адпаведнае даручэнне даў 21 студзеня Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка па выніках нарады, на якой абмяркоўвалася сітуацыя на рынку долевага будаўніцтва жылля ў рэспубліцы.

Грамадзяне часта сутыкаліся з тым, што бударганізацыі парушалі заяўленыя тэрміны здачы дамоў у эксплуатацыю, значна павышалі кошт жылля непасрэдна ў працэсе яго будаўніцтва. Шмат нараканняў выклікала і якасць жылля, якое ўзводзіцца.

Экспертамі ўрада і Адміністрацыі Прэзідэнта быў распрацаваны пералік мераў, што рэгламентавалі праваадносіны забудоўшчыкаў і дольшчыкаў і накіраваны, перш за ўсё, на абарону правоў грамадзян. У чэрвені 2006 года быў прыняты Указ № 396 «Аб долевым будаўніцтве шматкватэрных жылых дамоў», якім былі ўведзены жорсткія нормы дзяржрэгулявання, у тым ліку ў частцы захавання нязменнага кошту жылля ў працэсе будаўніцтва.

Аднак у рэальнасці ўзмацненне жорсткасці на рынку долевага будаўніцтва прывялі да таго, што будаўнічыя арганізацыі страцілі камерцыйны інтарэс: бо нават па аб'ектыўных прычынах, звязаных, напрыклад, з падаражаннем будаўнічых матэрыялаў, немагчыма было ажыццяўляць карэкціроўку цэнаў для дольшчыкаў. У выніку долевае будаўніцтва ў рэспубліцы было практычна спынена. А гэта, у сваю чаргу, выклікала значны рост цэнаў на рынку другаснага жылля.

Як падкрэсліў у час нарады кіраўнік дзяржавы, ва ўзнікшай сітуацыі вінаваты ўрад і Адміністрацыя Прэзідэнта, якія не прадугледзелі ўсе наступствы раней прапанаваных мераў.

«Няма неабходнасці гаварыць, што будаўніцтва жылля ў Беларусі яшчэ доўга будзе прыярытэтам. Гэта не толькі вырашэнне галоўнай праблемы для грамадзян, але і добры лакаматыў для развіцця эканомікі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Сёння ў Беларусі, паводле яго слоў, неабходна нарошчваць аб'ёмы будаўніцтва жылля, у тым ліку за кошт зберажэнняў грамадзян. У сувязі з гэтым вельмі важна прадаставіць будаўнічым арганізацыям магчымасць умацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Будаўнікі павінны мець пэўны зазор у цэнаўтварэнні, права карэкціраваць цану ў рамках інфляцыі, лічыць Прэзідэнт.

Аднак у аснову беларускага заканадаўства аб долевым будаўніцтве жылля неабходна закласці інтарэсы грамадзян, перакананы Прэзідэнт. «Важна знайсці залатую сярэдзіну, што задаволіла б і будаўнікоў, і грамадзян, якія ўдзельнічаюць у долевым будаўніцтве. Яны плацяць грошы, а таму павінны ведаць, якой якасці будзе тавар, у якія тэрміны і па якім кошце», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

У ліку плануемых новаўвядзенняў — памер прыбытку забудоўшчыка не павінен перасягаць 5 працэнтаў ад каштарыснай вартасці аб'екта долевага будаўніцтва адносна жылля, што будуецца для грамадзян, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. На жыллё для тых, хто такімі не з'яўляюцца, гэта норма не распаўсюджваецца.

Карэкціроўка цаны ў ходзе будаўніцтва магчыма толькі ў выпадку змянення ў адпаведнасці з заканадаўствам статыстычных індэксаў у сувязі з падаражаннем будаўніча-мантажных работ або змянення заканадаўства аб выплаце ўскосных падаткаў.

Як было адзначана, сёння ў сярэднім квадратны метр жылля, якое ўзводзіцца для тых, хто мае патрэбу, каштуе $490. Адным са спосабаў недапушчэння рэзкага росту цэнаў у сферы жыллёвага будаўніцтва дзяржава бачыць павелічэнне аб'ёмаў будаўніцтва жылля. Плануецца, што да 2010 года ў гарадах не менш за 80 працэнтаў ад агульнага аб'ёму ўзводзімага жылля будзе адводзіцца для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Гэта ж датычыцца і долевага будаўніцтва.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч падкрэсліў, што ў Беларусі аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва «неабходна павялічыць у 2—3 разы».

Каб скараціць перадумовы для магчымага падаражання кошту жылля ў працэсе будаўніцтва, дагаворы з дольшчыкамі павінны заключацца толькі пасля таго, як будуць вырашаны ўсе праектна-каштарысныя пытанні, перакананы Пётр Пракаповіч. Такім чынам, будаўнікі не змогуць перакладваць на плечы дольшчыкаў аплату недапрацовак і недахопаў праекціроўшчыкаў або геадэзістаў.

Прэзідэнт падтрымаў думку намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталлі Пяткевіч, якая выступіла за скарачэнне колькасці тэхнічных умоў, што даюць магчымасць узнімаць цану ў працэсе будаўніцтва.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўказ наогул павінен прадугледжваць мінімум акалічнасцяў, узнікненне якіх будзе лічыцца падставай для падаражання долевага будаўніцтва. У час абмеркавання намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Леанід Анфімаў выказаўся супраць устанаўлення абмежаванняў узроўню рэнтабельнасці пры будаўніцтве жылля для грамадзян, якія не стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Адбылася таксама дыскусія па агульных пытаннях жыллёвага будаўніцтва. Гэтай тэматыцы будзе прысвечана асобная нарада ў Прэзідэнта Беларусі. Як было адзначана, сёння даволі востра стаіць праблема адтоку за мяжу спецыялістаў, занятых у сферы будаўніцтва. У якасці аднаго з варыянтаў у сувязі з гэтым Пётр Пракаповіч прапанаваў адмяніць нарміраванне заработнай платы ў будаўніцтве. Гэта дасць магчымасць бударганізацыям павялічваць зарплаты сваім супрацоўнікам у залежнасці ад атрыманага прыбытку і павысіць у спецыялістаў зацікаўленасць працаваць у сваёй краіне, а не выязджаць некуды на заработкі.

Падводзячы вынікі абмеркавання, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Долевае будаўніцтва павінна быць адроджана ў бліжэйшы час. Тое, што новы дакумент будзе падпісаны толькі ў гэтым годзе, — вялікі недахоп. Безумоўна, будаўнікам трэба менш даваць пралазаў для павышэння кошту жылля. І там, дзе мы можам дапамагчы насельніцтву, — дапамагчы трэба. Але калі мы недзе «заціскаем» эканоміку, неабходна прыняць тэрміновыя меры».

Кіраўнік дзяржавы даручыў Наталлі Пяткевіч і Пятру Пракаповічу на працягу года ажыццяўляць дакладны маніторынг рэалізацыі ўказа і далажыць аб рэзультатах па выніках 2008 года.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Навасёлы з вуліцы Дуброўнай

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маленькі, яму яшчэ няма і двух гадкоў, Алег КАРСЮК хоць і не здольны ўсведамляць, якія шчаслівыя пачуцці перажываюць яго бацькі, атрымаўшы новую трохпакаёвую кватэру, але, напэўна, гэтак жа адчувае: камфорт, і ўтульнасць, і прастору. Плошча жылля ў Алены і Уладзіміра цяпер сапраўды на зайдрасць — дзевяноста дзевяць квадратных метраў. Гэта вытворча-сельскагаспадарчы кааператыў «Семежава» ўклаў грошы ў рэканструкцыю старога будынка дзіцячага сада, у выніку ў вёсцы з'явілася новае жыллё. Сярод тых, хто меў патрэбу ў паляпшэнні ўмоў, была і сям'я Карсюкоў. Алена Мікалаеўна працуе бухгалтарам у гэтай гаспадарцы, муж Уладзімір — лепшы механізатар Капыльскага раёна, узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». У гэтыя дні семежаўская сям'я, як кажуць, «у поўным складзе»: на канікулы прыехала старэйшая дачка Вольга — навучэнка-выдатніца Нясвіжскага педагагічнага каледжа.

БУДЗЕ ХОЛАДНА, ДА ВЫХАДНЫХ ПАЦЯПЛЕЕ

У сераду, 23 студзеня, на тэрыторыю Беларусі рушаць больш халодныя паветраныя масы са Скандынавіі. Месцамі пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Уначы падмарозіць да мінус 2—8 градусаў. А ўдзень будзе ад нуля да мінус 5.

Захаваецца марознае надвор'е і ў чацвер, 24 студзеня. У начныя гадзіны чакаецца мінус 4—10 градусаў. Пры праясненні тэмпература паветра панізіцца да 13 градусаў марозу. Удзень — ад нуля да мінус 6.

Аднак такое пахаладанне будзе нядоўгім. Ужо ў пятніцу, 25 студзеня, атлантычны цыклон прынясе ападкі. Уначы тэмпература паветра складзе ад 1 да 7 градусаў ніжэй за нуль. Дзённая тэмпература будзе вагацца ад 4 градусаў марозу на ўсходзе краіны да 1 градуса цяпла на захадзе.

БЕЛТА.

БУДСЛАЎСКІ КАСЦЁЛ СТАЎ ПЕРАМОЖЦАМ АКЦЫІ «СЕМ ЦУДАЎ МІНШЧЫНЫ»

паведамілі ў аддзеле па справах моладзі Вілейскага райвыканкама. За касцёл аддалі свае галасы 15 тыс. 593 наведвальнікі вэб-сайта, спецыяльна распрацаванага для галасавання.

Другое месца заняў Палацава-паркавы ансамбль Радзівілаў у Нясвіжы (15 тыс. 105 галасоў). Затым у спісе «сямі цудаў» Уваскрасенскі сабор у Барысаве (14 тыс. 846), Фарны касцёл у Нясвіжы (14 тыс. 673), касцёл святога Міхаіла Архангела ў Івянцы (14 тыс. 434), касцёл Уздзвіжання Святога Крыжа ў Вілейцы (14 тыс. 426), касцёл святога Аляксея ў Івянцы (14 тыс. 015).

БЕЛТА.

Па чутках і аўтарытэтна

МЕДЫКІ ЗАСПАКОЙВАЮЦЬ: не спяшайцеся бегчы па карвалол

«Карвалольны бум» накрыў учора расійскія аптэкі. Як паведамляюць расійскія СМІ, у многіх гарадах у гэты дзень перасталі адпускаць без рэцэпта такія масавыя лекі, як карвалол, валакардзін, валасардзін і пенталгін.

Падставай для спынення безрэцэптурнага продажу папулярных лекавых сродкаў, якія прысутнічаюць ці не ў кожнай хатняй аптэчцы, стала пастанова расійскага ўрада «Аб зацвярджэнні спіскаў моцнадзейных і ядавітых рэчываў». Згодна з гэтым дакументам, да моцнадзейных ці ядавітых рэчываў былі аднесеныя і ўсе лекавыя формы (незалежна ад іх гандлёвых назваў), у склад якіх уваходзяць пералічаныя ў спісе рэчывы, і, у прыватнасці, фенабарбітал, які ўваходзіць у склад усім вядомых карвалола і валакардзіна. Расійскія журналісты ўжо прадказваюць, што цяпер чэргі з аптэк абавязкова перамесяцяцца ў паліклінікі.

Ці пагражае ажыятаж беларускім аптэкам? І ці можа быць спынены ў Беларусі безрэцэптурны водпуск карвалолу? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся ў Міністэрства аховы здароўя нашай краіны.

— Я хачу адразу заўважыць, што ў пералік безрэцэптурных лекавых прэпаратаў уключаюцца толькі тыя лекавыя сродкі, склад і дзеянне якіх пры прымяненні ў тэрапеўтычных дозах, указаных у інструкцыі па прымяненні, не выклікаюць рызыкі развіцця ўскладненняў ці сур'ёзных пабочных эфектаў, — патлумачыла **намеснік начальніка Упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння міністэрства Ала ДАЛГОЛІКАВА**. — Пераважна карвалол і валакардзін патрабуецца немаладым ужо людзям. Гэта на сёння адны з самых даступных па сваім кошце сродкаў лекавай самадапамогі. Прычым фенабарбітал утрымліваецца там у зусім невялікай колькасці. Але хачу падкрэсліць, што і Міністэрства аховы здароўя, і Міністэрства ўнутраных спраў вельмі ўважліва адсочваюць сітуацыю з легальным абаротам лекавых сродкаў, якія ўтрымліваюць наркатычныя і псіхатропныя рэчывы. А паколькі карвалол і валакардзін таксама ўтрымліваюць нязначныя дозы псіхатропных рэчываў, то і іх рэалізацыя ў аптэках намі таксама рэгулярна адсочваецца. Пакуль што ніякіх сігналаў аб злоўжываннях да нас не паступала. У адны рукі адпускаюцца, згодна з зацверджанымі нормамі водпуску, не больш як два флаконы. Некалькі гадоў таму ў Міністэрства аховы здароўя сталі паступаць ад асобных грамадзян трывожныя сігналы аб злоўжываннях некаторымі наведвальнікамі аптэк спіртазмяшчальных настоек, у прыватнасці, прапаноўвалася забараніць свабодны водпуск настоек сардэчніку і глогу. Але ўрачы не падтрымалі іх заклапочанасць, тым больш што тая ж настойка глогу з'яўляецца лёгкім проціарытмічным сродкам, які практычна не мае ніякіх пабочных эфектаў, і палічылі, што трэба пакінуць безрэцэптурны водпуск гэтых лекаў.

Увогуле арсенал лекавых сродкаў з высокім профілем бяспекі, якія падыходзяць для прафілактыкі і самалячэння, у свеце пастаянна расце, таму што не спыняецца праца па вывучэнні эфектыўнасці і бяспечнасці лекавых сродкаў, якія выкарыстоўваюцца ў практычнай медыцыне. На сёння мы не падзяляем заклапочанасці нашых расійскіх калег і не плануем пераглядаць наша стаўленне да карвалолу і валакардзіну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ДЗМІТРЫЙ МЯДЗВЕДЗЕЎ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ КАНДЫДАТАМ У ПРЭЗІДЭНТЫ

Цэнтральная выбарчая камісія ў панядзелак афіцыйна зарэгістравала Дзмітрыя Мядзведзева ў якасці кандыдата на пасаду прэзідэнта Расіі.

Пасведчанне кандыдата было ўручана не самому Мядзведзеву, а яго прадстаўніку — сакратару прэзідыума генсавета «Адзінай Расіі» Вячаславу Валодзіну.

ЦВК абнародавала звесткі пра даходы і маёмасць кандыдата ў прэзідэнты. Прыбытак Мядзведзева за апошнія чатыры гады склаў 7 мільёнаў 748 рублёў. Кандыдат таксама мае восем банкаўскіх рахункаў на якіх размешчана 2 млн 740 тыс 06 рублёў 50 капеек. У якасці нерухомай маёмасці кандыдат валодае маскоўскай кватэрай агульнай плошчай 367,8 квадратнага метра, а таксама ўчасткам зямлі ў Маскоўскай вобласці плошчай 4700 квадратных метраў на правах арэнды. На банкаўскім рахунку жонкі кандыдата Святланы Мядзведзевай — сума 380 рублёў 20 капеек.

СПАД НА АЗІЯЦКІХ БІРЖАХ «ПАДАРВАЎ» ЕЎРА

Магутны абвал адбыўся ўчора на Такійскай фондавай біржы, а таксама на іншых азіяцкіх рынках. За імі «рухнулі» Расія і Еўропа: індэкс РТС знізіўся за дзень амаль на 7 працэнтаў.

Галоўнай прычынай глабальнага спаду эксперты называюць пасіўныя планы адміністрацыі прэзідэнта ЗША па пераадоленні спаду ў эканоміцы ЗША. У Японіі падзенне фондавага рынку стала самым значным з 2005 года: індэкс Nikkei рухнуў на 3,86 працэнта. Найбольш пацярпелі звязаныя з амерыканскім рынкам аўтамабільныя, электратэхнічныя, металургічныя кампаніі. Заўважным падзеннем курсавых індэксаў адкрылі 21 студзеня работу і вядучыя фондавыя біржы Еўрасаюза. Да самага нізкага ўзроўню за апошнія пяць месяцаў упаў учора абменны курс еўра ў дачыненні да японскай іены. Па-ранейшаму моцна еўра і ў дачыненні да долара ЗША і дасягнулі мінімуму апошніх трох тыдняў — 1,4486 долара за еўра.

КАРЫСНЫЯ АБДЫМКІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

21 студзеня адзначаецца Дзень абдымкаў. Каб адсвяткаваць яго, дастаткова проста абняць каго-небудзь: каханага чалавека, калегу, прадаўца ў краме, вадзіцеля таксі...

Лічыцца, што свята нарадзілася сярод студэнтаў Заходняй Еўропы ў 70-х гадах мінулага стагоддзя. Праўда, прычына, па якой свята выпала менавіта на гэту дату — невядомая. На думку вучоных, адны дадатковыя абдымкі працягласцю 20 секунд у дзень дапамагаюць чалавеку адчуць сябе больш шчаслівым, а дзеці, якіх абдымаюць штодня, развіваюцца хутчэй за аднагодкаў.

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧУЮ ТЭХНІКУ КРАДУЦЬ... ТЭРАРЫСТЫ?

Трактары, прычэпы, экскаватары, квадрацыклы і іншыя сельскагаспадарчыя машыны сталі ўлюбёнай мэтай угоншчыкаў у Вялікабрытаніі.

Як лічаць эксперты, зламыснікі замяняюць таблічкі з серыйнымі нумарамі скрадзеных машын, пасля чаго вывозяць іх у Польшчу і іншыя краіны Усходняй Еўропы, а таксама ў Аўстралію. Кошт скрадзенай тэхнікі дасягае трох мільёнаў фунтаў стэрлінгаў за год. Следчыя мяркуюць, што за ўгонамі трактароў стаяць вопытныя злачынцы, якія раней маглі браць удзел у арганізацыі тэрарыстычных актаў у Ірландыі.

СТРАЛОК ПАКВАПІЎСЯ НА БАРСЕТКУ З ЕЎРА

У Гродне па дапамогу да праваахоўнікаў звярнуўся 24-гадовы мясцовы жыхар: паўгадзіны таму ўзброены пісталетам невядомы страляў па ім, спрабуючы адабраць барсетку з валютай.

Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» старшы інспектар ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Алег Дук, у пацярпелага на руках знаходзілася 4800 еўра, якія ён атрымаў пасля продажу свайго аўтамабіля на рынку. На гэтыя грошы і паклаў вока рабаўнік, які напаў на гродзенца на прыпынку маршрутнага таксі. Злачынца тройчы стрэліў у сваю ахвяру і запатрабаваў аддаць яму барсетку, аднак, натыкнуўшыся на жорсткі адпор такому нахабству (такімі грашыма так проста не кідаюцца), знік. Між іншым, як высветлілася, крымінальнік страляў з пнеўматычнага пісталета: металічныя шарыкі трапілі ў лобную, скроневую і патылічную частку галавы пацярпелага, пашкодзіўшы скураны покрыў. Параненаму аказана медыцынская дапамога, яго стан здароўя не выклікае апасенняў. Што ж датычыцца злачынцы, то яго затрымалі ў ходзе ўведзенага плана «Сірэна» супрацоўнікі ДАІ Свіслацкага раёна: 20-гадовы жыхар вёскі Дрэчаны ехаў у якасці пасажыра ў аўтамабілі «Пежо», які спынілі для праверкі. У яго канфіскаваны пнеўматычны пісталет калібру 4,5 мм.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРАМА НА ВІЛЬНЮС

З 15 лютага з Магілёва будзе курсіраваць прамы цягнік на Вільнюс.

У Магілёўскім аддзяленні Беларускай чыгункі паведамілі, што раней, каб дабрацца з Магілёва да літоўскай сталіцы, трэба было на адзін цягнік браць два білеты: адзін да Мінска, другі — з Мінска да Вільнюса. Узнікала блытаніна і з коштам бялізны.

Цяпер для зручнасці пасажыраў і чыгуначнікаў вырашана зрабіць цягнік прамой нумарацыі. Як і раней, ён будзе адпраўляцца з Магілёва ў 23.58 кожныя аўторак, пятніцу і суботу. І, адпаведна, з Мінска ў 6.30 раніцы кожную сераду, суботу і нядзелю. Прыбываць у Вільнюс будзе ў 11 гадзін. Захаваецца ранейшы ўзровень цэнаў на білеты: найбольш танны ў агульны вагон каштуе каля 25 тысяч рублёў, самы дарагі ў купэ — прыкладна 55 тысяч рублёў.

Ілона ІВАНОВА.

ЛЬГОТЫ ПА ГАРАДСКІМ І ПРЫГАРАДНЫМ АЎТАТРАНСПАРЦЕ ДЛЯ АФГАНЦАЎ НЕ СКАСОЎВАЛІСЯ

Воіны-афганцы захоўваюць магчымасць бясплатных паездак у гарадскім і прыгарадным аўтамабільным транспарце — аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый.

Гэтыя льготы па праездзе для афганцаў не скасоўваліся і працягваюць дзейнічаць у адпаведнасці з пагадненнем краін СНД «Аб узаемным прызнанні правоў на льготны праезд для інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама прыраўнаваных да іх асобаў» ад 12 сакавіка 1993 года. У прыватнасці, пагадненне вызначае, што права на бясплатны праезд на гарадскім і прыгарадным аўтамабільным транспарце маюць не толькі інваліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, але і ўдзельнікі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, і ў тым ліку — усе без выключэння афганцы.

Сяргей ГРЫБ.

КАНТРАБАНДА БОЛЬШ ЗА BR200 МЛН

Смаргонскія пагранічнікі канфіскавалі кантрабанду агульным коштам больш за Br200 млн. Аб гэтым паведамілі ў прэс-цэнтры Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі.

У пунктах пропуску «Каменны Лог» і «Гудагай-1» пры афармленні рэйсавых аўтобусаў накірункамі «Вільнюс—Мінск» і «Каўнас—Мінск», а таксама цягніка, які накіроўваўся з Вільнюса ў Маскву, пагранічнікі знайшлі схаваныя ад мытнага афармлення больш за 400 мабільных тэлефонаў і 750 картак памяці да іх. Усе канфіскаваныя тавары перададзены Ашмянскай мытні.

Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.

ПАРАСЯТЫ ЗГАРЭЛІ. А САБАЧКУ ЎДАЛОСЯ ВЫРАТАВАЦЬ

У ноч на 20 студзеня ў вёсцы Ляткі Мастоўскага раёна гарэў свінарнік, які належыць ЗАТ «Гудзевічы». У цагляным будынку свінагадоўчага комплексу «Іскра» пабудовы 1988 года ўтрымлівалася 190 парасят.

Уначы тут дзяжураць два чалавекі. «Вартоўня» размешчана за семдзесят метраў ад будынка з маладняком. Вартаўнік заўважыў пажар, калі зайсці ўнутр памяшкання было ўжо немагчыма. Тры аддзяленні выратавальнікаў — пажарных з Мастоўскага і Ваўкавыскага райаддзелаў па надзвычайных сітуацыях паўгадзіны тушылі адкрыты агонь на даху свінарніка. У агні загінулі 190 парасят, якім было да двух месяцаў. Шыферны дах знішчаны цалкам. Папярэднія страты — 10 мільёнаў рублёў. Прычыну пажару высвятляе аператыўная група.

А ў гарадскім пасёлку Астравец правяліся падкі лёд сабака і выў так, што ў відавочцаў сэрца ад болю сціскалася. Ніхто не спадзяваўся, што жывёла зможа доўга цялёпкацца ў ледзяной вадзе. Але добра, што мясцовая жыхарка Леанарда Базюк выклікала выратавальнікаў.

Вадзіцель пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 1 Астравецкага райаддзела па надзвычайных сітуацыях старшына ўнутранай службы Аляксей Яскулоўскі ціснуў на педаль газу. У лічаныя секунды аддзяленне старшыны ўнутранай службы Анатоля Жулянкова прыступіла да выратавальных работ. Малодшага сяржанта Ігара Мароза абвязалі вяроўкай, на лесвіцы-палцы ён перасоўваўся па слабым лёдзе да сярэдзіны ракі. Да змучанай жывёлы было каля дзесяці метраў. Лёд, які не вытрымаў нават вагі сабакі, пагражальна патрэскваў. Разам з камандзірам аддзялення малодшы сяржант Віталь Багдановіч страхаваў Ігара Мароза. А знясілены сабака ўжо ішоў пад лёд. Вынырваючы, ён з апошніх сілаў спрабаваў затрымацца на вадзе. Паводле слоў Ігара Мароза, жывёла быццам адчувала, што выратаванне блізка.

Ледзь жывога сабаку з абмарожанымі заднімі лапамі выратавальнікі перадалі ў рукі гаспадыні. Раніцай яны пацікавіліся здароўем жывёлы і вельмі ўзрадаваліся, што яна выжыла і ўжо ходзіць на сваіх чатырох.

Раіса МАСЬКО,
галоўны спецыяліст цэнтра прапаганды і абучэння Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС.

МАСАВЫ ШЛЮБ ПАЛІЦЭЙСКІХ

Масавы шлюб узялі паліцэйскія ў сталіцы Кітая. 100 пар маладажонаў прыбылі з усіх канцоў краіны ў Пекін для ўдзелу ў гэтай цырыманіі.

Усе без выключэння маладыя пазнаёміліся на службе — у ходзе патрулявання вуліц, на начных дзяжурствах і выездах на месцы здарэння.

БЕЛТА—Сіньхуа.

РАБАЎНІК БАНКА ВЫЙГРАЎ У ЛАТАРЭЮ $1 МІЛЬЁН

Злачынца з горада Барнстэйбл (штат Масачусетс), які адбывае пяцігадовы тэрмін за рабаванне мясцовага банка, выйграў у латарэю $1 мільён, паведамляюць інфармагенцтвы.

Беспрацоўны жыхар з горада Барнстэйбл Цімаці Эліёт, якому споўнілася 55 гадоў, трапіў у турму пасля спробы абрабаваць банк у родным горадзе ў кастрычніку 2006 года. На гэты крок ён пайшоў з-за цяжкага фінансавага становішча і немагчымасці знайсці пастаянную работу.

Паводле даных мясцовых СМІ, адвакат асуджанага паведаміў журналістам, што па закону ўлады штата Масачусетс не маюць права адбіраць выйгрыш у яго падабароннага, таму што той купіў шчаслівы латарэйны білет за некалькі дзён да ўчынення злачынства. У той жа час не агаворваецца, чаму ён знайшоў гэты білет толькі цяпер.

Прадстаўнікі наглядных органаў штата Масачусетс заявілі прэсе, што асуджаны не мае права карыстацца выйгрышам да таго моманту, пакуль той цалкам не адбудзе зняволенне. Па рашэнню суда Эліёт павінен штомесяц выплачваць у казну штата $65 за судовыя выдаткі і пакрыццё прычыненай банку шкоды.

Кар. БЕЛТА.

Прыгожае жыццё

У кроку ад звання «Топ-мадэль свету»

Беларуску Алену Аладку спыніла былая сапернiца дырэктара Нацыянальнай школы прыгажосці па конкурсе «Міс Еўропа».

22-гадовая беларуска Алена Аладка заняла другое месца сярод прадстаўніц 41 краіны на прэстыжным конкурсе «Топ-мадэль свету». Удалай дэбютантцы прапанавалі прыехаць на работу ў парыжскае агенцтва «Эліт». Пераможцай жа па выніках дэфіле ў купальніках, джынсах і вячэрніх сукенках стала немка Алесандрэ Алорэс, якая мае ўкраінскія карані. Цікава, што ўдзельніцы з Германіі часцей за астатніх мадэляў прызнаваліся лепшымі ў свеце.

— Лена ў добрай форме, яна вельмі запатрабаваная як мадэль у Маскве, таму не дзіва, што яе аканілі на гэтым конкурсе, — перакананa Вольга Сяржнікава, дырэктар Нацыянальнай школы прыгажосці. — Я нават лічу, што наша Лена лепшая за пераможцу, бо Алесандрэ больш міс, чым мадэль. Я ж разам з ёй удзельнічала ў конкурсе «Міс Еўропа» чатыры з паловай гады таму.

Я дазванілася Алене. Аказалася, што дзяўчына рыхтуецца да экзамену па метадалогіі і гісторыі, які здае сёння (сёлета Лена заканчвае БДУ). Акрамя таго, яна крыху прыхварэла, узніклі праблемы з галасам, бо зараз у Алены перыяд акліматызацыі пасля вяртання з Егіпта. І ўсё ж мінчанка падзялілася сваім уражаннем ад удзелу ў конкурсе.

— У адрозненне ад конкурсу «Міс свету», дзе на рэпетыцыю адводзіцца месяц, тут нам выдзелілі зусім мала часу, — кажа Лена. — Тры дні мы рэпецiравалі па 12 гадзін над пастаноўкай шоў. Безумоўна, было цяжка, але мы ж прафесіяналы ў мадэльнай справе. Я адчувала, што магу трапіць у 15 лепшых, але, каб прабіцца ў тройку! Мяне

Злева направа: беларуска Алена АЛАДКА, якая стала першай віцэ-міс, топ-мадэль свету немка Алесандрэ АЛОРЭС і другая віцэ-міс егіпцянка Лобна АМІН.

прыемна здзівіла, што журналістаў на гэтым конкурсе было больш, чым на «Міс свету».

У якасці прыза пераможцы ўручылі сертыфікаты на падарожжа ў Тайланд на тры тыдні і на сямідзённае знаходжанне ў гатэлі Хургады, дзе праводзіўся конкурс. З нямецкай мадэллю будзе падпісаны кантракт на суму дзесяць тысяч долараў ЗША. Алене Аладцы дасталіся тры тысячы долараў і ўпрыгажэнне з жэмчугам. Праўда, беларуска падарыла яго сястрычкам з Яраслаўля Ані і Жэні, якія хварэлі за яе ў час конкурсу. Маленькія расіянкі мараць стаць мадэлямі, і ўпрыгажэнне, на думку Лены, павінна стаць для іх талісманам.

Ірына ПРЫМАК.

МУС адзначае парушэнні ў ходзе несанкцыянаванай вулічнай акцыі ў Мінску

Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі адзначае факты шматлікіх парушэнняў у ходзе несанкцыянаванай вулічнай акцыі, якая прайшла ўчора ў цэнтры Мінска. Аб гэтым паведаміў часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Алег Слепчанка.

«Мала таго, што мітынг, які яны наладзілі на Кастрычніцкай плошчы, быў першапачаткова несанкцыянаваны ўладамі — яны яшчэ наладзілі шэсце ў накірунку плошчы Незалежнасці. Сваімі дзеяннямі ўдзельнікі акцыі правакавалі перакрыцце вулічнага руху, дэстабілізуючы парадак у цэнтры сталіцы», — адзначыў прадстаўнік МУС.

Учора каля 1 тыс. асобаў узялі ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу на Кастрычніцкай плошчы, дзе выказвалі пратэст супраць указа Прэзідэнта № 760, які датычыцца парадку рэгістрацыі індывідуальных прадпрымальнікаў. Пасля маніфестанты накіраваліся ўздоўж праспекта Незалежнасці да Дома ўрада, перыядычна выходзячы на праезную частку і ўступаючы ў проціборства з міліцыяй.

Міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімір Навумаў, які выйшаў да калоны маніфестантаў, якая выйшла да будынка Урада, сказаў, што да арганізатараў беспарадкаў у цэнтры горада будзе прыменена крымінальная адказнасць і фізічная сіла, калі яны не разыдуцца з плошчы на працягу дзесяці хвілін. «Вас усяго тысяча чалавек, а вы паралізавалі ўвесь горад», — сказаў міністр.

Праз некаторы час сіламі правапарадку ўдзельнікі вулічнай акцыі былі разгрупаваны.

Нагадаем, 10 студзеня па ініцыятыве груп індывідуальных прадпрымальнікаў была праведзена аналагічная несанкцыянаваная акцыя, па выніках якой праваахоўнымі органамі было затрымана 27 чалавек, з іх — 3 прадпрымальнікі.

Кар. БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.01.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 117,72
1 латвійскі лат	4 462,90
1 літоўскі літ	902,45
1 чэшская крона	118,63
1 польскі злоты	856,85
1 расійскі рубель	87,24
1 украінская грыўня	425,53

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,6456
10 UAH	48,4254
1000 BYR	11,4305
EUR	35,8298

Курс у гандлёвых кампаніях (на 21.01.2008 г.)

USD ... 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Сям'я мінчан акунаецца ў хрышчэнскую ваду сталічнага Камсамольскага возера.

Фота Вольгі ЛАСКІ.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

«Нельга адназначна сцвярджаць, што льготы захаваны. Гэтак жа — што яны адменены»

З вёскі Садавічы Капыльскага раёна патэлефанавала жанчына, якая прадставілася К. (прозвішча яна прасіла не згадваць). Пытанні яе датычыліся льготаў: па-першае, як сям'і загінулага падчас Вялікай Айчыннай вайны бацькі, па-другое, ужо самой заяўніцы — як інваліду II групы па зроку.

— Мы ведаем, што льготы сем'ям загінулых нядаўна былі адменены. Аднак убачылі фразу, якая дае нам надзею меркаваць, што менавіта для нашай сям'і яны будуць захаваны: калі ўдава, г. зн. мая маці паўторна не ўступала ў шлюб. З ільготамі непасрэдна мне як інваліду II групы быццам бы ўжо разабраліся: хоць у сельсавеце і адказалі, што яны адменены, у канкрэтных арганізацыях — гарпаліве, энергазбыце, гаргазе — мне адказалі, што імі непасрэдна я адна магу карыстацца. Хоць у нашай сям'і ўсе пенсіянеры: маці ўжо 87 гадоў, мужу — 71, мне — 66 гадоў, — расказала жанчына.

Пытанні заяўніцы мы пераадрасавалі начальніку ўпраўлення па працы і сацыяльнай абароне Капыльскага райвыканкама Валянціне Козіч. Высветлілася, што пад прозвішчам К. нам у рэдакцыю тэлефанавала яе дачка Л., сапраўды інвалід II групы.

— Калі гаварыць пра льготы заяўнікам як сям'і загінулага, яны сапраўды адменены, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» з 17 снежня 2007 года, — пацвердзіла Валянціна Сямёнаўна.

Што датычыцца ж прадастаўлення льготаў інвалідам I і II групы, нягледзячы на раней прагучаўшую па гэтым пытанні інфармацыю ў многіх газетах, сітуацыя не такая простая, як падаецца на першы погляд, зазначыла Валянціна Козіч. Справа ў тым, што ў Л. маюцца працаздольныя дзеці. Згодна з новым Законам, менавіта яны павінны ўзяць на сябе клопат па падтрымцы ўласных бацькоў, прычым, у незалежнасці ад таго, пражываюць яны разам з імі ці асобна. Аднак сам механізм пакуль не адладжаны. «Адпаведныя запыты кожная арганізацыя ці ўстанова, якая прадастаўляла гэтай катэгорыі грамадзян ільготы, як яны самі паведамілі нам падчас амаль штодзённых зносінаў, ужо накіравала ў свае вышэйстаячыя інстанцыі».

— Спадзяёмся атрымаць на іх адказы ў бліжэйшы час, — сказала начальнік упраўлення па працы і сацыяльнай абароне райвыканкама. — Таму пакуль нельга адназначна сцвярджаць, што льготы для інвалідаў I і II групы захаваны. Гэтак жа — што яны скасаваны. Пачакаем тлумачэнняў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Або дамовіцца з цяперашнім наймальнікам, або адпрацаваць на гэтым месцы яшчэ адзін год

Са Слаўгарадскага раёна з пытаннем звярнулася пенсіянерка (адрас і прозвішча ў рэдакцыі маюцца) адносна сваёй дачкі, якая як малады спецыяліст ужо адпрацавала па размеркаванні ў галіне культуры ў адным з аграгарадкоў Мсціслаўскага раёна два гады.

— Нядаўна з ёй заключылі працоўны дагавор на 2008 год. Але ж мы, бацькі, ужо пенсіянеры, хацелі, каб яна была бліжэй да нас, працавала, магчыма, у сваім раёне. Дык вось што мы хацелі б даведацца: ці можна дачцэ на законных падставах звольніцца з цяперашняга месца працы ў сувязі з тым, што ёй, як і іншым, скарацілі працягласць працоўнага водпуску? Я маю на ўвазе найперш тое, каб у яе працоўнай кніжцы не з'явілася ніякіх запісаў, якія б ў далейшым маглі б негатыўна паўплываць пры новым працаўладкаванні, — пыталася жанчына.

Жаданні і памкненні бацькоў у дачыненні да дачкі цалкам зразумелыя, але не трэба забывацца, што нядаўні малады спецыяліст ужо падпісала працоўны дагавор на гэты год, як сказала яе маці. На наш погляд, гэта станоўчы момант, які азначае, што наймальнік цэніць гэтага работніка. У апошняга ж (ці ў бацькоў?) не знайшлося ніякіх насамрэч сур'ёзных матываў, каб адмовіцца ад прапановы наймальніка на стадыі заключэння працоўнага дагавора на 2008 год. Як мы мяркуем, наўздагон была выкарыстана фармальная нагода: адмова ад прадаўжэння работы ў сувязі са змяненнем істотных умоў працы (чытай — скарачэннем працягласці працоўнага водпуску). У «Звяздзе» ад 17 студзеня начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Інэса Чысцякова патлумачыла, што выдадзенае работніку папярэджанне аб змяненні істотных умоў працы трэба разглядаць як інфармацыю аб змяненнях у заканадаўстве і прапанову аб падпісанні дадатковага пагаднення. Паколькі дачка заяўнікаў ужо падпісала працоўны дагавор, спыняць працоўныя адносіны з наймальнікам лепш за ўсё, напрыклад, па пагадненні бакоў або ў сувязі з пераводам да іншага наймальніка. Чаму б гэтаму самаму цяперашняму наймальніку не патлумачыць: бацькі старэнькія, ім патрабуецца догляд. Але ён можа і адмовіць. Вырашаць жа пытанне ў судовым парадку, як гаварылася вышэй, не ўваходзіць у планы заяўнікаў, каб не «сапсаваць» працоўную кніжку. Дарэчы, і запіс аб адмове ад прадаўжэння работы ў сувязі са змяненнямі істотных умоў працы можа праз гады адыграць не лепшую ролю ў лёсе дзяўчыны: хто тады ўспомніць, што прадыктаваны ён быў змяненнямі ў заканадаўстве?

Таму, калі дамовіцца з наймальнікам не атрымаецца, падаецца, што лепшае выйсце — адпрацаваць на ранейшым месцы яшчэ адзін год. Гэта і стаж, і вопыт, і сведчанне запатрабаванасці спецыяліста, і, калі хочаце, «чыстая» працоўная кніжка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Анатоля КЛЕЦКІЧУКА.

Дар'я Гойка з вёскі Рычоў Жыткавіцкага раёна пражывае ў хаце, якая, па сутнасці, з'яўляецца «жывым» музейным экспанатам. Традыцыйная палеская печ, драўляная мэбля і посуд, ложак з вышыванымі падушкамі — такія цяпер рэдка сустрэнеш у новых вясковых і тым больш гарадскіх дамах. Дар'я Гойка — з перасяленцаў 70-х гадоў з вёскі Колкі, якіх перавезлі, калі ствараўся ваенны палескі палігон. Дар'я Кірылаўна захавала шмат традыцыйных мясцовых рэцэптаў, па якіх можна прыгатаваць толькі ў такой вось печы.

Спорт-тайм

Лепшы тэнісіст Славеніі — беларус



Лідар беларускага мужчынскага настольнага тэніса Уладзімір Самсонаў стаў першым на адкрытым чэмпіянаце Славеніі. У фінале ён выйграў у Лі Чанга з Ганконга — 4:2.

Хуткія педалі

На трэцім этапе Кубка свету ў Лос-Анджэлесе (ЗША) Васіль Кірыенка заваяваў першы медаль трэкавага сезона. Беларускі веласіпедыст стаў сярэбраным прызёрам у скрэтчы (15 кіламетраў, 60 кругоў). Васьміразовая чэмпіёнка свету Наталля Цылінская здабыла «золата» ў спрынце.

Запальваецца новая зорка фрыстайла

Цудоўна складваецца сезон для беларускага паветранага акрабата Антона Кушніра. Калі нешта не складваецца ў сярэбранага прызёра Алімпіяды ў Турыне Дзмітрыя Дашчынскага, менавіта Антон прыходзіць камандзе на выручку. Днямі ён прынёс у скарбонку зборнай сярэбраны медаль амерыканскага этапу Кубка свету па фрыстайле.

Зборная на густ балельшчыкаў

Афіцыйны сайт УЕФА надрукаваў склад каманды-2007 па версіі больш як 3,75 мільёна наведвальнікаў. Самым запатрабаваным і папулярным сярод іх аказаўся лепшы футбаліст свету Кака. Ён і Сцівен Джэрард *(на фота)* трапілі ў гэтую сімвалічную зборную другі год запар.

Цалкам каманда выглядае так: Ікер Касільяс («Рэал», Іспанія), Даніэл Алвес («Севілья», Іспанія), Аляксандра Неста («Мілан», Італія), Джон Тэры («Чэлсі», Англія), Эрык Абідаль («Барселона», Іспанія), Крышціяну Раналду («Манчэстар Юнайтэд», Англія), Сцівен Джэрард («Ліверпуль», Англія), Кака («Мілан», Італія), Кларанс Зеедорф («Мілан», Італія), Златан Ібрагімавіч («Інтэрнацыянале», Італія), Дзідзье Драгба («Чэлсі», Англія). Трэнерам названы Алекс Фергюсан з «Манчэстар Юнайтэд».

Перамогу ці гальштук?

Пакуль унічыю (1:1) завяршаюцца сустрэчы барысаўскага БАТЭ з сапернікамі па групе «D» на XVI міжнародным турніры «Кубак Садружнасці». У гульні з дублем кіеўскага «Дынама» ў складзе нашай каманды вызначыўся Сяргей Крывец, у паядынку з армянскім «Бананцам» — Міхаіл Сівакоў. Каб гарантавана выйсці ў наступны этап, сёння чэмпіёнам Беларусі патрэбна перамагчы ташкенцкі «Пахтакор». Цікава, што пакуль барысаўчане абараняюць гонар нашай краіны ў Санкт-Пецярбургу, у галоўнага трэнера БАТЭ 30-гадовага Віктара Ганчарэнкі нарадзіўся сын. Магчыма, новаспечанаму бацьку каманда паднясе ў якасці падарунка зусім не гальштук, як у анекдоце, а выхад з групы?

Загінулыя ў «групе смерці»

Беларускія гандбалісты завяршылі сваё выступленне на чэмпіянаце Еўропы ў Нарвегіі. Зборная нашай краіны ўступіла ўсім сваім сапернікам папярэдняга турніру: з лікам 26:34 яна прайграла немцам, 31:36 — іспанцам і 26:31 — венграм. Цікава, што першае месца ў «групе смерці» ў выніку заняла Венгрыя, якую напярэдадні першынства не разглядалі як фаварыта кватэта. Акрамя беларусаў, са спаборніцтвамі ўжо развіталіся чэхі, расіяне і славакі.

Хэнлан вяртаецца

Экс-галоўны трэнер зборнай Беларусі па хакеі Глен Хэнлан у бліжэйшы час зноў прыступіць да работы з галоўнай камандай нашай краіны. Пасля адстаўкі з пасады настаўніка НХЛаўскага «Вашынгтон Кэпіталз» паўдзёваамерыканскі спецыяліст атрымаў прапанову ад кіраўніка ФХРБ Уладзіміра Навумава папоўніць штаб нашай нацыянальнай каманды ў якасці трэнера-кансультанта. Хэнлан наведае паядынак падмаскоўнага МУС з магнітагорскім «Металургам», дзе плануе сустрэцца з беларусамі, якія выступаюць за гэтыя клубы, — форвардам Алегам Антоненкам і галкіперам Андрэем Мезіным. А 29 студзеня трэнер прыедзе ў Мінск і возьме ўдзел у падрыхтоўцы беларускай дружыны да міжнароднага турніру «Кубак Палесся».

Нежартоўныя амбіцыі

У зборных Беларусі і Казахстана «нежартоўныя амбіцыі» ў адборачным турніры чэмпіянату свету па футболе-2010. Такое меркаванне выказаў галоўны трэнер украінскай нацыянальнай каманды Аляксей Міхайлічэнка на прэс-канферэнцыі ў Кіеве. Каментуючы перамовы аб календары гульняў 6-ай еўрапейскай адборачнай групы ЧС-2010, якія нядаўна прайшлі ў Загрэбе (Харватыя), трэнер адзначыў «невераглодную адказнасць», з якой каманды Беларусі і Казахстана паставіліся да складання календара. «Гэта ў чарговы раз сведчыць аб іх нежартоўных амбіцыях. Думаю, барацьба ў нашай групе будзе вельмі цікавай і насычанай. Аднак упэўнены, што ў нас ёсць патэнцыял дасягнуць поспеху», сказаў А. Міхайлічэнка.

«Напачатку рэцэпты народнай медыцыны на сабе выпрабоўваю, ужо потым — іншым раю»

Чаму я чытаю «Звязду»

Людміла Уладзіміраўна ЛАШКОЎСКАЯ, пенсіянерка, вёска Граўжышкі Ашмянскага раёна, падпісчыца з 30-гадовым стажам:

— «Звязда», як ужо неаднойчы гаварылася, газета на роднай мове. Мне ў ёй падабаецца ўсё. Звычайна параблю ўсе справы па гаспадарцы, увечары сяду з газетай у руках і — чытаю ад «корачкі» да «корачкі». Вось сёння паштальёнка нешта затрымалася, дык я ўжо не адзін раз схадзіла да паштовай скрыні: ці няма «Звязды»?

Не толькі газету чытаю, але і раблю шмат выразак, у мяне і папачкі спецыяльныя ёсць, якія я рэгулярна папаўняю. Што канкрэтна цікавіць? Зямельныя пытанні: падаткі, афармленне ўчасткаў па новых правілах. У нас зямлі каля 20 сотак, трэба будзе ўвесну ўшчыльную занясцца гэтым пытаннем. Як пенсіянерку (а ў мяне льготная пенсія), ды і маіх аднавяскоўцаў, цікавяць і гэтыя пытанні, у прыватнасці, ці будуць зменены тэрміны выхаду на пенсію. Заўсёды чытаю Крука з Катовіч. Мы ж і раней сутыкаліся з гэтым малавядомым нам бокам жыцця, а як патлумачыць многія з'явы, што рабіць у тым ці іншым выпадку — не ведалі. Палітыкай цікаўлюся, новымі прызначэннямі. Часам і курсы валют бываюць патрэбнымі *(смяецца)*.

Асобнае дзякую вам за «Краіну здароўя» — нам вельмі падабаецца. Я зноў жа пра сваіх аднавяскоўцаў скажу. Ведаеце, раней нейк болей газет выпісвалі, цяпер вось часта да мяне па параду ідуць, асабліва пенсіянеры — ведаюць, што я матэрыялы збіраю. Як бабуля, раю і дзецям, і ўнукам чытаць гэтую ўкладку. Лекі ж зараз дарагія, а вы парады народнай медыцыны друкуеце. Я шмат ужо чаго выкарыстала на практыцы. Спачатку сама ўсё выпрабую, праверу, а потым ужо іншым рэкамендую (*смяецца*). Пра сад, агарод цікава чытаць, шмат зноў жа карыснага. Вось нядаўна прачытала, як букет даўжэй захаваць.

У мяне і бацькі некалі любілі выпісваць і чытаць «Звязду», дарэчы, па маёй рэкамендацыі. Так-так, вы правільна зразумелі: менавіта я ім газету параіла. Зараз жыве толькі бацька, яму 82 гады, ён былы малалетні вязень. Часта гасцюе ў мяне, дык калі разам з намі жыве, кажа: можна мне і дадому «Звязду» выпісаць? Я яму: навошта два экзэмпляры, пакуль ты ў нас?

Вельмі паважаю «Фотаслова» Пясецкага: выражу, часам нават словы завучу. Пра гербы падабаецца чытаць, я ўвесь час углядаюся: можа дзе і маё прозвішча прамільгне *(смяецца)*. Пакуль не знайшла, дарэчы, і ў «звяздоўскую» латарэю мне пакуль не шанцуе, колькі разоў я картку ўдзельніка ні адпраўляла. Увогуле хацелася б бачыць на старонках газеты больш матэрыялаў на гістарычную тэму, мы ж мала ведаем: пра мясцовасць, паходжанне. Не зусім падабаецца рэклама, яна мне падаецца лішняй.

З задавальненнем чытаю адказы юрыста, вельмі карысная рубрыка, збіраю такія матэрыялы. Друкуйце іх больш, хоць, зразумела, што юрыст дае адказы на канкрэтныя пытанні, што паступілі. Адзначу «Хроніку апошніх падзей» — кароткa, але ёмка, прачытаў і — можна выпуск навін па тэлебачанні не глядзець.

Калі аб прапановах гаварыць, дык хацелася б, каб на старонках «Звязды» з'явілася рубрыка, у матэрыялах якой вялася гаворка пра храмы Беларусі — і праваслаўныя, і каталіцкія. Пачынаючы з гісторыі — што, калі ўзнікла. На радыё ёсць падобная перадача, але не заўсёды ёсць час і магчымасць яе паслухаць, а да газеты заўсёды можна вярнуцца.

Зімовыя зацемкі

ТРЫМАЙ МЯНЕ, САЛОМІНКА, ТРЫМАЙ!

На стары Новы год да мяне зазірнула суседка, з якою не бачыліся, лічы, з мінулага года. Вялікая аматарка весялосці, шумных застолляў, доўгіх святкаванняў, толькі праз два тыдні дазволіла сабе невялікі перадых. «Ну што чуваць у пустэльнікаў? — пачала яна, бразнуўшы свой немалы, але прывабны «корпус» на канапу. Яна не прамінае папікнуць мяне за нелюбоў да шумных мерапрыемстваў. Сама ж любіць паўтараць невядома чыё выказванне: «Я помню ўсіх, хто не паразваніў», і жыве, здаецца, пад такім дэвізам, хоць па характары і не злапомнае. Ліля працуе ў вялікай кампаніі, якія зараз як грыбы растуць у свабоднай эканамічнай зоне. Работай, здаецца, задаволена, як і ўсім жыццём наогул. Пра такіх кажуць: пазітыўны чалавек. Дык вось «справаздачу» пра ўсе святочныя дні Лілія пачала з карпаратыўнай вечарынкі. Не, спачатку ўсё ішло добра, было весела, хапала выпіўкі і закускі, забаўлялі спецыяльна нанятыя вядучыя... Усё і завяршылася б добра, каб не маленькі канфуз у самым канцы. Хто б мог падумаць, што прычынай яго стане заўсёды ціхая і спакойная супрацоўніца, вытрыманая, ветлівая, працавітая і добрасумленная на сваёй сціплай пасадзе. Ніколі на жыццё не скардзілася, зналі толькі, што адна выхоўвае дачку, што дзяўчына паступіла ў гэтым годзе на платнае аддзяленне ВНУ. Потым, калі абмяркоўвалі выпадак, хто сядзеў побач успомніў, што выпіла яна супраць звычайнага многа. Неяк непрыкметна сышла з-за стала. Ніхто не заўважыў, куды.

Цяпер застаецца радавацца шматлікім супадзенням і таму, што бяда не здарылася. Добра, што хлопцы, якія выйшлі пакурыць на лесвічны пралёт, затушылі акуркі і накіраваліся назад. Добра, што вецер быў дастаткова вялікі, і з расчыненай шыбы імгненна патыхнула холадам. Мужчыны падумалі, што акно на лесвіцы адчынілася само і паспяшаліся закрыць, каб не выхаладзіць памяшканне. Усё вырашылі секунды... і яе падхапілі на рукі ўжо амаль на карнізе расчыненага акна на лесвічным пралёце паміж пятым і шостым паверхамі.

Потым яе літаральна занеслі ў маленькі пакой, прыбеглі жанчыны, пакрысе супакоілі, адпаілі вадой. «Цяпер, дзякуй Богу, ва ўсіх хапае розуму на працы рабіць выгляд, што нічога не здарылася, — працягвала Ліля. — Стараемся лішні раз пагаварыць з чалавекам, хоць яна па-ранейшаму душу нікому не раскрывае».

Правільную тактыку паводзінаў, відаць, выбралі Ліліны калегі. Псіхолагі раяць у такіх выпадках гаварыць паболей з чалавекам, не пакідаць яго з самотнымі думкамі. Вырашальнымі могуць быць не толькі моцная рука, як расказана вышэй, але і слова, якое стрымае, стане апошняй выратавальнай саломінкай. Толькі на кожны такі выпадак рэцэпт не саставіць нават самы высокакваліфікаваны спецыяліст на той выпадак, калі ў чалавека не застаецца ніякіх аргументаў у дыскусіі з самім сабой. Нават Хемінгуэй, у якога былі сусветная слава, прыгожыя і адданыя жанчыны, дружбы з якім шукалі кіраўнікі не адной дзяржавы, як вядома, зняў са сцяны паляўнічае ружжо і перарваў сваё зямное існаванне. Але адна справа багаты, уплывовы, сталы пісьменнік, і зусім іншая — жанчына, што пакідае дзяцей.

Аднакурсніца, якая жыве ў Маскве, расказала пра сваю суседку. Заўсёды прыветлівая, ураўнаважаная, маці дваіх дзяцей, пры рабоце і мужу. Яны, жонкі афіцэраў, не былі блізкімі сяброўкамі, хутчэй, — добрымі суседкамі, сустракаліся кожны дзень, перамаўляліся. А потым суседка выйшла ... у акно з 11-га паверха. Так і засталося таямніцай, што насіў у душы знешне спакойны, добразычлівы чалавек. І не знайшлося побач таго, хто б стаў той самай выратавальнай саломінкай.

Добра разважаць, павучаць, — заўважыць нехта, — а калі ў цябе няма за што хлеба дзецям купіць, або няма грошай на аперацыю? Бывае. Але ж жыццёвая задача, мусіць, у тым і заключаецца, каб выжыць і знайсці выйсце. А вучыць мае права, хіба той, хто сам прайшоў праз многае. Вельмі шкадую, што з нашага горада паехала даўняя знаёмая, настаўніца рускай мовы і літаратуры. Пашанцавала вучням сталічнай школы, дзе яна зараз працуе. Алена Іванаўна вучыць не толькі літаратуры, найбольш, жыццю і чалавечнасці. Мала хто ведае, праз якія выпрабаванні цяжкай хваробай, здрадай, нястачай прайшла сама настаўніца. Казала, што ўтрымалі ды вылечылі праца ды ўласныя дзеці. Неяк вучні выпускнога класа папрасілі патлумачыць вычытанае імі выказванне Марыны Цвятаевай «Жыццё — гэта месца, дзе жыць нельга». Абяцала вярнуцца да тэмы на наступным уроку, падрыхтавалася. Умоўным эпіграфам да ўрока зрабіла радкі: «Лишь жить в себе самом умей, есть целый мир в душе твоей». Не ведаю, ці выпісала яна дзе гэтыя радкі, ці сама склала. Рыфмаваць Алена ўмее часам надзвычай удала, хоць у паэтку ніколі не запісвалася. Для таго, хто яе ведае, яе прыклад, факт яе існавання маглі б натхняць і ўсяляць нейкую надзею нават тады, як паводле трапнага купалаўскага слова «вужакі сыкаюць на сэрцы і душа валяецца ў балоце».

Як і прыклад брастаўчаніна — бацькі траіх дзяцей, што падняў, вывучыў трох дачок на невялікую выкладчыцкую зарплату. Жонка загінула, калі малодшай дзяўчынцы споўнілася толькі шэсць гадоў. У школу яе збіраў ужо сам. Уявіць толькі, як аднаму мужчыне спраўляцца з усімі клопатамі, калі дзяўчаты падрастаюць, калі хочуць не адставаць ад равеснікаў у паводзінах, у вопратцы і касметыцы, і няма пры гэтым мацярынскай парады і настаўлення, і вечна не хапае грошай... Ён прызнаваўся неяк, што бывалі хвіліны асаблівай роспачы. Што выручала? Калі-нікалі дапамагаў брат — і матэрыяльна, і добрым словам, парадай. Адчуваў спагаду з боку некаторых калег. Але галоўным чынам у сабе шукаў сілы і вытрымку. Згадваў сваю маці, якая выгадавала іх з братам адна, бо бацька загінуў на вайне. Зараз дзве дачкі нашага героя вывучыліся, працуюць, малодшая вучыцца на другім курсе платнага аддзялення. А ён не горш за любую маці спраўляецца складваць і перадаваць сумкі з правізіяй для студэнткі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

З ПЕКІНА Ў ГАМБУРГ. З ГРУЗАМ ЗА 15 ДЗЁН

У Брэсце прайшла прэзентацыя міжнароднага кантэйнернага цягніка

У нядзелю вечарам на станцыю Брэст-Усходні прыбыў дэманстрацыйны кантэйнерны цягнік Пекін—Гамбург. Дэманстрацыйны, таму што ён першы на такім накірунку, і павінен прадэманстраваць краінам-партнёрам магчымасці чыгункі ў справе аператыўнай дастаўкі грузаў. На брэсцкай станцыі састаў сустракалі прадстаўнікі чыгуначных ведамстваў шасці краін — удзельнікаў праекта: Кітая, Манголіі, Расіі, Беларусі, Польшчы і Германіі.

Яшчэ 9 студзеня на сустрэчы кіраўнікоў чыгункі названых краін у Пекіне было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Сёння Кітай — краіна з агромадным эканамічным патэнцыялам і развітай вытворчасцю. У год яна накіроўвае на экспарт у Еўропу мільёны грузавых кантэйнераў. Таму, натуральна, чыгунка зацікаўлена атрымліваць прыбытак за перавозку тавараў. А паводле інфармацыі міжнароднай асацыяцыі «Каардынацыйны савет па транссібірскіх перавозках», тэхнічныя магчымасці транссібірскага маршруту складаюць 300 тысяч кантэйнераў у год па ўсіх накірунках. Нашай краіне таксама выгадна быць часткай еўра-азіяцкага транзіту. Тым больш што ў Брэсце, на беларуска-польскай мяжы, ёсць вялікія магутнасці перагрузачнай і складской інфраструктуры. Маюцца тэрміналы па перапрацоўцы кантэйнераў для самых разнастайных відаў грузаў. А на станцыі Брэст-Паўночны можна перапрацоўваць, захоўваць рэфрыжэратарныя кантэйнеры ва ўмовах зададзенай тэмпературы. Як заўважыў начальнік Беларускай чыгункі Уладзімір Жарало, Брэсцкі чыгуначны вузел можа прапанаваць гібкую сістэму збыту тавараў з краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна ў Заходнюю Еўропу.

Адным са звёнаў гэтай сістэмы або яго першай ластаўкай і стаў цягнік, які ўрачыста сустракалі ў пагранічным Брэсце. Састаў выйшаў са станцыі Дахунмэнь 9 студзеня, а ў Гамбургу яго чакаюць 24 студзеня. Кіраўнік кітайскай дэлегацыі Лі Баожэнь выказаў задаволенасць ходам рэалізацыі праекта. Былі аднадушныя з калегам прадстаўнікі чыгункі еўрапейскіх краін. Асноўная частка грузаў паміж кантынентамі перавозіцца морам. А дастаўка па чыгунцы можа быць ажыццёўлена ў тры разы хутчэй.

Цікава, што амаль адначасова з сустрэчай цягніка Пекін—Гамбург з Брэста адправілі першы кантэйнерны цягнік з камплектуючымі для аўтамабіляў нямецкага канцэрна Volkswagen на станцыю Калуга. Плануецца, што 22 студзеня груз сустрэне яго атрымальнік у Калузе. А да пачатку ліпеня цягнік павінен выйсці на штосутачны графік курсіравання. У расійскім горадзе збіраюць аўтамабілі з запчастак, якія вырабляюцца на заводах Чэхіі і Славакіі. А дастаўляць іх будзе расійская кампанія «ТрансКантэйнер» разам з нямецкімі і беларускімі партнёрамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«МАСТАЦТВА І ПРАВАСЛАЎЕ»

Учора ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адкрылася духоўна-асветніцкая праграма «Мастацтва і праваслаўе». Мэта яе прагучыць парадаксальна для чалавека постсавецкай эпохі — раскрыццё глыбокай узаемасувязі навукі і рэлігіі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Праграма гэта з'яўляецца вынікам супрацоўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы і Нацыянальнай акадэміі навук. Яна ўключае ў сябе выставу ў сценах Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору (Мінск, вуліца Сурганава, 1, корп. 2), выступленне творчых калектываў і пасяджэнне «круглага стала» на тэму «Рэлігія і мастацтва», якое адбудзецца сёння, 22 студзеня.

— На сучасным этапе развіцця беларускай дзяржавы духоўнасць, культура і мастацтва адыгрываюць выключную ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, — сказаў на адкрыцці праграмы Аляксандр ЛАКОТКА, член-карэспандэнт НАН Беларусі, дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. — Гэта асабліва важна ва ўмовах глабалізацыі, распаўсюджвання масавай культуры, фармалістычных плыняў у мастацтве. Духоўныя традыцыі важныя для фарміравання нацыянальнага твару беларускай дзяржавы.

— Хрысціянская традыцыя разглядае творчасць як адну з праяў у чалавечай прыродзе вобраза і падабенства Бога, якога мы спавядаем як Творцу неба і зямлі, — патлумачыў галоўнае ў еднасці мастацтва і рэлігіі Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт ФІЛАРЭТ.

Духоўна-асветніцкая праграма будзе доўжыцца да канца гэтага тыдня, а выстава прадоўжыць сваю працу да 8 лютага.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Мінскі абласны выканаўчы камітэт выказвае глыбокае спачуванне былому памочніку старшыні аблвыканкама Ясінскай Раісе Віктараўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

СВЯТАЯ ВАДА І «ІНСТЫНКТ» НАТОЎПУ

Пра гаючую сілу хрышчэнскай вады сказана шмат і калі б у гэта не верылі, то не было б так шматлюдна ля храмаў. І нават адсутнасць снегу і марозу, як у мінулую суботу, тут не перашкода. Мы ўжо прызвычаіліся да «капрызаў» надвор'я. Ды і ўрачыстасць моманту, пагадзіцеся, вартая таго, каб прастаяць пад пранізлівым ветрам і дажджом даволі працяглы час. І затым падзяліцца цудадзейнай вадой з дарагімі для вас людзьмі, якія зза дрэннага здароўя або па іншых прычынах не здолелі прыйсці ў храм на Вадохрышча.

Такія пачуцці, верагодна, грэлі душу не толькі аўтара гэтых радкоў. Аднак як толькі завяршыліся малітва і асвячэнне вады, то давялося, на жаль, адчуць і эмоцыі зусім іншага кшталту. Людзі, якія толькі што прыслухоўваліся да слоў святара пра вечнае, раптам сталі... натоўпам. Чаргі ўжо не існавала, хто больш спрытны (хоць правільней, відаць, гаваруць пра нахабства) — кінуўся да ёмістасцяў з вадой, адціскаючы плячамі іншых. Якая ўжо тут урачыстасць моманту... Такое ўражанне, што ты вярнуўся ў эпоху татальнага дэфіцыту, калі ў краме заканчваецца тавар, а заўтра — чарговае падаражанне.

— Праваслаўныя! Вады хопіць усім. Вядзіце сябе прыстойна, усміхніцеся адзін аднаму ў гэты дзень, — заклікаў мужчына, які, пэўна, уваходзіць у савет царкоўнага прыхода.

Аднак «інстынкт» натоўпу быў мацнейшы і адзінае, што ты мог яму проціпаставіць у дадзенай сітуацыі (не ўвязвацца ж у спаборніцтва мускулаў ля сцяны славутага храма) — гэта адысці ўбок. Але табе ўсё роўна сорамна.

— Не давайце столькі вады ў адны рукі! Не заходзьце з іншага боку! Выклікаць міліцыю!— данеслася з натоўпу.

— Як вам не сорамна прыходзіць па святую ваду з бруднымі бутэлькамі, — гэта ўжо абураласа жанчына ў белым халаце, якая наліваla ваду.

Дзякуй яшчэ Богу, што ў навядзенні парадку ля царквы не давялося ўдзельнічаць супрацоўніку міліцыі, які тут знаходзіўся. Прыкладна праз паўгадзіны сітуацыя нармалізавалася, верагодна, пасля таго, як пэўная катэгорыя прысутных нарэшце задаволіла свае патрэбы. З якімі ж пачуццямі пакідалі яны храм? Што набылі і што страцілі? Ці задумаліся, што святая вада каштоўная не проста сама па сабе, а калі чалавек з годнасцю сябе паводзіць?

Зрэшты, няхай хрышчэнская вада дапаможа ўсім.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Крымінал, здарэнні

УЗАРВАЎСЯ КАЦЁЛ. НІХТО НЕ ПАЦЯРПЕЎ

У пятніцу а палове другой дня адбыўся выбух катла ў адной з секцый Заходняй міні-ТЭЦ у Пінску. Цеплацэнтраль забяспечвае цяплом заходнюю частку горада і чатыры буйныя прадпрыемствы.

Катлы абслугоўваюць 11 чалавек. На вялікае шчасце, нікога з работнікаў у гэты момант побач з катлом не аказалася. Як сказаў начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення праматамнагляду Віктар Шпара, прычыны здарэння высвятляюцца. Створана спецыяльная камісія, якая зробіць свае высновы пасля 10 дзён работы. Кацёл, які выбухнуў, быў выраблены ў 1989 годзе. У ліку прычын, што прыводзяць да надзвычайных здарэнняў, спецыялісты называюць недастатковы кантроль адказных асобаў за тэхнічным станам абсталявання. Але ж канчатковае слова скажа толькі камісія. Відавочным з'яўляецца тое, што ТЭЦ панесла вялікі ўрон. На ліквідацыі наступстваў выбуху працуюць тры дзесяткі чалавек, чатыры адзінкі тэхнікі. Перабояў з цяплом, горад амаль не адчуў. Было задзейнічана рэзервовае абсталяванне.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ГРАНАТА... НА СМЕТНІКУ

19 студзеня на палігоне бытавых адходаў паблізу вёскі Новая Мілееўка Магілёўскага раёна рабочы спецаўтапрадпрыемства ў час працы знайшоў баявую гранату. 38-гадовы трактарыст зайшоў у дыспетчарскую і... стаў яе разбіраць. У выніку небяспечных дзеянняў яна ўзарвалася.

Ад выбуху пацярпелі два чалавекі. Сам трактарыст страціў кісць рукі, атрымаў шматлікія асколачныя раненні і пералом сцягна. Ён шпіталізаваны ў Магілёўскую бальніцу хуткай дапамогі: знаходзіцца ў рэанімацыі і яго стан ацэньваецца як цяжкі, але стабільны. У тую ж бальніцу з раненнямі шпіталізавана 32-гадовая дыспетчар — жанчына таксама знаходзілася ў памяшканні ў час выбуху.

Ілона ІВАНОВА.

МАЦІ?..

На пазамінулых выхадных у Мінску праваахоўнікі пачалі пошук жанчыны, якая рашылася на страшны ўчынак — нарадзіла дзіця і... выкінула: на сталічным пустыры па вуліцы Бялецкага было знойдзена цельца нованароджанай дзяўчынкі ў поліэтыленавым пакеце.

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, з гэтага моманту супрацоўнікі Маскоўскага РУУС сталіцы пачалі карпатлівую працу, спрабуючы ўстанавіць усе акалічнасці злачынства. Вынікі расследаванне прынесла на пятыя суткі, калі ў сваёй кватэры была затрымана 27-гадовая жыхарка мікрараёна Паўднёвы-Захад 6. Як высветлілася, дзікі ўчынак — на сумленні жанчыны, якая з'яўляецца маці... траіх дзяцей. Незамужняя жанчына, дарэчы, зараз знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску — хлопчык у яе нарадзіўся год таму, а дзвюм дзяўчынкам — пяць і сем гадоў. Калі ж жанчына зацяжарала ў чацвёрты раз, яе састарэлая маці, з якой яны пражываюць разам (апошняя хварэе і практычна не ўстае) безапеляцыйна заявіла дачцэ: «Прынясеш чацвёртага — дадому не пушчу!» Зараз цяжка вызначыць, гэтыя словы, ці штосьці іншае падштурхнула мінчанку да дзікунства. Устаноўленыя ж факты сведчаць пра наступнае: нарадзіла дзіця жанчына дома — у ваннай, а потым перарэзала пупавіну, паклала дзяўчынку ў поліэтыленавы пакет і закідала рэчамі. На наступны дзень перахавала ў шафу. А яшчэ праз дзень, прыхапіўшы пакет, яна разам са знаёмымі, якім напляла, што тр

Дыскусія прафесіяналаў

РЭФОРМА ШКОЛЫ: РЭВІЗІЯ ЗДЗЕЙСНЕНАГА...

(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 18 студзеня.)

Своеасаблівым псіхалагічным бар'ерам для бацькоў аказаўся пераход на навучанне дзяцей у школе з шасці гадоў, а таксама пераход на 12-гадовы тэрмін навучання. Начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Ірына Дрыга агучыла вынікі праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам сацыялагічнага апытання. Высветлілася, што толькі 20 працэнтаў бацькоў, 15 працэнтаў вучняў выпускных класаў і 18 працэнтаў студэнтаў-першакурснікаў падтрымліваюць ідэю павелічэння навучання ў школе да 12-ці гадоў. Больш за палову першакурснікаў, 43 працэнты бацькоў і 39 працэнтаў навучэнцаў лічаць, што ўвядзенне 12-годкі спрыяе неабгрунтаванаму павелічэнню тэрмінаў навучання ў школе, і, як вынік, 40 працэнтаў першакурснікаў і 33 працэнты школьнікаў лічаць, што гэта ўскладняе і перашкаджае ўваходжанню моладзі ў самастойнае жыццё. Рэспандэнты таксама ўказалі, што юнакі будуць заканчваць школу ўжо ў прызыўным ўзросце, што аўтаматычна зніжае іх шанцы на паступленне. У той жа час 35 працэнтаў бацькоў паведамілі, што, паводле іх меркавання, пачынаць навучанне з 6 гадоў занадта рана. Прыкладна палова бацькоў і ў той жа час толькі 30 працэнтаў навучэнцаў і першакурснікаў лічаць, што навучанне трэба пачынаць з 7 гадоў. Увогуле за пачатак навучання з шасці гадоў галасуюць больш школьнікаў і першакурснікаў і толькі 25 працэнтаў бацькоў.

Паводле меркавання экс-міністра адукацыі Васіля Стражава, які цяпер узначальвае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, разважаць сёння трэба не аб тым, з якога ўзросту трэба распачынаць навучанне ў школе (з шасці ці з сямі гадоў), а аб тым, як і чаму навучаць шасцігодак.

— Узрост першакласнікаў зніжаўся ў нашай краіне паступова. Так, да рэвалюцыі дзеці ішлі ў школу з 9 гадоў. З 1920 года савецкая ўлада знізіла ўзрост пачатку навучання да 8 гадоў. А ў 1984 годзе ЦК КПСС і Савет Міністраў прынялі рашэнне аб абавязковым навучанні дзяцей з шасці гадоў. Мала хто памятае, але ў Беларусі ў 1986—1989 гадах ад 93 да 95 працэнтаў першакласнікаў былі шасцігодкамі. Праўда, для шасцігодак трэба было ствараць асаблівыя ўмовы для навучання. Таму ў складаны перыяд пачатку 90-х гадоў дырэктары школ пачалі «выпіхваць» са сваіх устаноў шасцігодак. І ў 1994—1997 гадах іх у школе засталося толькі 40 працэнтаў, а ў Мінску — і ўвогуле 20 працэнтаў.

Скептычна ставіцца Васіль Стражаў і да апасенняў, што «пераросткі» пачнуць ствараць свае сем'і яшчэ ў час вучобы ў школе ці атрымліваць разам са школьнымі атэстатамі павесткі ў ваенкамат. Па-першае, у сённяшняй арміі ёсць з каго выбіраць (у армію ідзе служыць толькі кожны трэці прызыўнік). І, зразумела, што ўчарашнія школьнікі ваенкаматы мала цікавяць. Куды з большай ахвотай армія выбірае папаўненне з кола выпускнікоў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных ці вышэйшых навучальных устаноў. Да таго ж у Мінску вось ужо як чатыры гады школу заканчваюць 18-гадовыя маладыя людзі і ніхто з іх шлюб не бярэ. У гэтым годзе 60 працэнтаў выпускнікоў, якія заканчваюць 11-годку, развітаюцца са школай у 18-гадовым узросце. А ў Мінску будуць мець 18-гадовы ўзрост 80 працэнтаў выпускнікоў. Арыфметыка простая: дзеці, якія пайшлі ў школу ў 7 гадоў і навучаліся па праграме 11-гадовай школы, завяршаюць навучанне ў 18 гадоў.

— Дзіўная справа, — заўважыў Васіль Стражаў. — Супраць дыферэнцыяцыі навучання сёння ніхто не выступае. Праблема неабходнасці індывідуалізацыі навучання вельмі сур'ёзна паўстала напрыканцы 80-х гадоў перад савецкай школай, дзе абсалютна не ўлічваліся адукацыйныя запыты і прафесійныя намеры навучэнцаў. Гэта быў яе галоўны недахоп. Дык чаму сёння пад сумненне ставіцца пераход старшай школы на профільнае навучанне? Профільнае навучанне — лагічны працяг дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання, якія з'яўляюцца ключавымі ў абнаўленні зместу і структуры рэфармуемай школы. Ва ўсім свеце на старшай ступені школы ўведзена профільнае навучанне, і ў Еўропе не засталося ніводнай краіны з 11-гадовым тэрмінам навучання пасля таго, як Расія ў мінулым годзе ўзаконіла 12-гадовую школу. Увогуле пытацца ў вучняў, колькі яны хочуць навучацца, сама меней неразумна. Таксама як пытацца ў бацькоў, з якога ўзросту яны хочуць аддаваць сваіх дзяцей у школу. Адказы вядомыя загадзя. Ніхто з дзяцей не скажа, што ён хоча навучацца больш, таксама як і бацькі лішні год захочуць патрымаць сваё дзіця ў дашкольнай установе. Такія даследаванні трэба праводзіць, каб зразумець, наколькі насельніцтва правільна інфармаванае аб рэформах, якія ажыццяўляюцца, але іх вынікі не могуць з'яўляцца ключом да рашэння праблемы. Любы фізіёлаг і псіхолаг вам скажа, што станаўленне чалавека адбываецца паміж 17 і 18 гадамі. А хто ў найбольшай ступені зможа паўплываць на фарміраванне патрыятызму і грамадзянскай пазіцыі? На сёння толькі школа, а не сям'я. І калі падлетак будзе да 18 гадоў знаходзіцца пад наглядам педагогаў, то гэта будзе добра і для сям'і, і для грамадства, і для краіны.

Заступіўся за профільнае навучанне і дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі.

— Сёння фарміруецца памылковае меркаванне аб абавязковым пераходзе з 2008/2009 навучальнага года ўсіх навучальных устаноў на профільнае навучанне. А гэта можа дыскрэдытаваць саму ідэю і прывесці да фармальнай арганізацыі профільнага навучання без наяўнасці для гэтага неабходных умоў, — падзяліўся сваімі апасеннямі Генадзь Пальчык. — Як вынікае з артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб агульнай сярэдняй адукацыі», профільнае навучанне — магчымая, але не абавязковая форма арганізацыі навучання на старшай ступені школы. Пры арганізацыі профільнага навучання трэба ўлічваць мноства фактараў: гэта і якасць дапрофільнай падрыхтоўкі, і гатоўнасць навучэнцаў да выбару профілю, і наяўнасць метадычнай і матэрыяльна-тэхнічнай базы для арганізацыі розных профіляў навучання, і ўзровень прафесійнай кампетэнцыі педагагічных кадраў.

Для ажыццяўлення прафесійнага самавызначэння навучэнцаў вялікае значэнне будзе мець іх псіхолага-педагагічнае суправаджэнне і наладжаная ў навучальнай ўстанове прафарыентацыйная работа. Пры масавым увядзенні профільнага навучання сітуацыя «рызыкоўнага» выбару змяшчаецца як мінімум на 3 гады раней, у базавую школу, прычым не толькі для тых, хто збіраецца навучацца ў ПТУ ці ССНУ, але і для тых, хто плануе прадоўжыць навучанне на старшай ступені школы. Дарэчы, вопыт эксперыментальных школ, дзе праходзіла «абкатку» Канцэпцыя профільнага навучання, паказаў, што старшакласнікі надзвычай прагматычныя — як правіла, яны аддаюць перавагу тым курсам па выбару, якія дазволяць ім лепш падрыхтавацца да ўступных іспытаў у ВНУ, а па гэтай прычыне многія праграмы і дапаможнікі курсаў па выбару аказаліся ў эксперыментальных школах не запатрабаванымі.

Неабходна таксама нарматыўнае рэгуляванне пытанняў пераходу вучняў з аднаго профільнага класа ў іншы і адносінаў паміж рознымі ўстановамі адукацыі ва ўмовах міжшкольнай арганізацыі профільнага навучання (матэрыяльныя выдаткі, арганізацыя перавозкі дзяцей, адказнасць за іх жыццё і здароўе). Абавязкова трэба будзе пакінуць у старшай школе і агульнаадукацыйныя класы, таму што не ўсе выпускнікі базавай школы гатовыя прыняць рашэнне аб шляхах атрымання будучай прафесіі, і многія з іх будуць імкнуцца атрымаць завершаную агульную сярэднюю адукацыю ў добра знаёмым адукацыйным асяроддзі з найменшымі адукацыйнымі нагрузкамі.

— Нядаўна я пацікавіўся ў дырэктара школы іх справамі. І той пахваліўся, што 75 працэнтаў выпускнікоў школы паступілі ў ВНУ, — расказаў Аляксандр Радзькоў. — Гэта і сапраўды яскравы паказчык, але не самы важны. Мне хацелася б пачуць іншую фразу: «З маіх выпускнікоў у жыцці ўсе ўладкаваліся». Паводле інфармацыі Міністэрства адукацыі, у 2006 годзе 2500 выпускнікоў сярэдняй школы засталіся неўладкаваныя — не пайшлі вучыцца і не працаўладкаваліся. І 1700 з іх здзейснілі правапарушэнні.

Рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Яўген Роўба паведаміў, што паводле даных гродзенскага рэгіянальнага цэнтра тэсціравання, 85 працэнтаў выпускнікоў лічаць, што падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання павінна распачынацца за два-тры гады да паступлення, адпаведна, школьнікі зацікаўленыя ў паглыбленым вывучэнні прадметаў на працягу апошніх гадоў навучання ў школе. І калі ўмовы для больш глыбокага вывучэння тых ці іншых прадметаў не будуць створаны ў школах, то гэту нішу зойме корпус рэпетытараў. Фактычна гэта ўжо адбываецца. Звярнуў увагу школьных педагогаў Яўген Роўба таксама на праблемы з навыкамі вуснай камунікацыі, з напісаннем рэфератаў, эсэ, курсавых работ, з якімі сутыкаюцца іх першакурснікі. На яго думку, гэта ўплыў цэнтралізаванага тэсціравання і муштравання школьнікаў на здачу тэстаў. І ўсё ж такі, на думку рэктара, сістэме сярэдняй адукацыі патрабуецца сёння не рэзкі паварот, а развіццё ўсяго найлепшага, зробленага за 10 гадоў правядзення рэформы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Інфарм-укол

СТРАСЦІ СЦІХЛІ — НАДЫШЛА ПАНІКА

Абсалютная большасць мужчын не ўпадаюць у істэрыку ад думкі аб тым, што за бурнымі страсцямі абавязкова надыдзе ахалоджванне пачуццяў. Моцны пол адносіцца да гэтага філасофску

Знікла патрэба штохвілінна абдымацца і выкарыстоўваць любы момант, каб зрываць адзін з аднаго адзенне? Гэта не значыць, што мужчына не жадае аднаўлення колішняй страсці. Жадае. Але без панікі і страху перад тым, што калі тэрмінова не пачаць «рэстаўрацыйныя» работы, то абавязкова здарыцца штосьці жудаснае. Справа ў тым, што мужчыны больш шчырыя ў сваіх пачуццях (а таму, відавочна, больш адкрытыя). Жанчына, калі адчувае, што яе сэксуальнае жыццё пачынае прабуксоўваць, думае аб тым, як ёй будзе цяжка і дрэнна, калі мужчына збяжыць ад яе па вострыя адчуванні. А мужчына, калі заўважыць некаторы спад «тэмпературы», думае аб тым, што ёсць у свеце гармонія і... уздыхае з палёгкай, паколькі немагчыма вытрымліваць шалёны тэмп больш як 1,5—2 месяцы. Такая фізіялогія. Але праз нейкі час важна будзе злавіць той момант, калі варта актывізавацца і пачаць праяўляць вынаходніцтва. Проста паболей увагі — да партнёра, да сябе, сваіх адчуванняў і сэксуальных інстынктаў.

ШТО ТАКОЕ ФІЗІЯЛАГІЧНАЯ КАНТРАЦЭПЦЫЯ?

Гэты спосаб заснаваны на ўстанаўленні перыяду авуляцыі — адрэзку часу, калі надыход цяжарнасці найбольш верагодны.

Рызыка зачацця ёсць толькі падчас выхаду яйцаклеткі ў брушную поласць, а таксама ў папярэднія і наступныя 24—48 гадзін, на працягу сумарнага часу жыцця яйцаклеткі і сперматазоіда. Неабходна ўлічваць некалькі абставінаў:

— авуляцыя можа адбыцца на некалькі (2—3) дзён раней, напрыклад, на 9—11-ы дзень замест меркаванага 14-га. Часцей за ўсё заўчасная авуляцыя можа адбывацца падчас інтэнсіўнага палавога акта пад уплывам моцнага аргазму;

— сперматазоіды ў палавых шляхах жанчыны захоўваюць здольнасць да зачацця праз 1—2 дні пасля палавога акта;

— авуляцыя можа адбыцца і са спазненнем — пад уплывам дэпрэсіўных стрэсавых сітуацый, недасыпання, стомленасці.

Перыяд авуляцыі вызначаецца па базальнай тэмпературы. Для яе вызначэння неабходна карыстацца адным тэрмометрам, вымяраць тэмпературу раніцай, напрыклад, з 7.00 да 8.00, лежачы на баку са злёгку сагнутымі каленямі. Вузкую частку тэрмометра трэба ўвесці ў прамую кішку. Працягласць працэдуры — 6—7 хвілін. Неабходна запісваць даныя тэмпературы, дату і дзень цыкла (першы дзень цыкла — першы дзень менструацыі), пажадана весці графік. Не вызначаць тэмпературу пры вострых інфекцыйных захворваннях.

Лічыцца, што верагоднасць зачацця знікае праз 2—3 дні пасля ўздыму базальнай тэмпературы вышэй за 37 градусаў. З гэтага часу і да канца менструацыі палавы рэжым можа быць свабодным. Захаванне павышанай тэмпературы 16—17 дзён і болей указвае на цяжарнасць. Метад не можа быць рэкамендаваны пры парушэннях (нерэгулярнасці) менструальнага цыкла, а таксама да яго аднаўлення пасля родаў і абортаў. Пры вытрымліваніі ўсіх правілаў фізіялагічны метад кантрацэпцыі досыць эфектыўны, не мае пабочных эфектаў і проціпаказанняў.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рыбакі прыехалі

в. Альшаны Столінскага раёна.

Шануй сваё!

ПРЫГАЖОСЦЬ ПА-ПАНСКУ І ЗРУЧНАСЦЬ ПА-СЯЛЯНСКУ

Адны імкнуліся насіць прыгожае і дарагое. Другія — зручнае, але па-свойму прыгожае. А чаму адзенне беларускіх сялян на працягу стагоддзяў мянялася вельмі марудна, а вышэйшае саслоўе так ахвотна мяняла сваё аблічча — паводле ўсіх патрабаванняў тагачаснай еўрапейскай моды? І ці не адтуль наша сённяшняя цікавасць да моды і жаданне сумясціць у вопратцы зручнасць і прыгажосць?

Цяпер знайсці адказы на гэтыя пытанні прасцей, калі выйшлі ў свет кнігі «Мужчынскі касцюм на Беларусі» і «Жаночы касцюм на Беларусі». Яны сталі вынікам дзесяцігадовай працы Валянціны Бялявінай і Любові Ракавай. І па тым, як разышлася першая кніга, можна меркаваць, што тэма гэтая вельмі цікавіць нашых сучаснікаў, якія сёння не толькі пра развіццё касцюма могуць даведацца, але па ім могуць скласці вобраз сваёй краіны, уявіць, якою яна была ў якія часы. І чаму менавіта такою...

У гэтым нам дапаможа разабрацца адна з аўтарак кніг кандыдат гістарычных навук Валянціна БЯЛЯВІНА.

— Чалавек без касцюма — проста біялагічная асобіна, — гаворыць Валянціна Бялявіна. — Калі чалавек апранаецца, то яго вопратка можа пра яго шмат чаго расказаць. Таму што касцюм вызначае сацыяльны стан, паходжанне, асабістыя густы, прыхільнасці. Калі мы працавалі над гэтай тэмай, то звярталіся ў нашы абласныя музеі. Справа ў тым, што ў іх у асноўным ёсць народныя вопраткі, а гарадскога касцюма ў музеях сабрана наогул вельмі мала. Але нам вельмі дапамаглі іх калекцыі фатаздымкаў, якія адлюстроўвалі моду пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя і на пачатку XX стагоддзя. На фатаздымках можна пабачыць касцюм усіх сацыяльных саслоўяў — як шляхты, так нават і жабракоў, якія насілі тое, што давалі іншыя. Але сацыяльны стан было відаць: торбы праз плячо вісяць — зразумела было, што гэта жабракі. Гэта дало нам магчымасць узнавіць аблічча беларускага горада перш за ўсё ў яго сацыяльнай шматаблічнасці — як вярхоў, так і нізоў.

— Разумею, што вясковы касцюм мае нацыянальныя асаблівасці — на ім ёсць арнамент, вышыўка. А ці былі ў касцюме беларускай шляхты нейкія нацыянальныя асаблівасці?

— У XVI стагоддзі касцюм польскіх і літоўскіх магнатак альбо шляхцянак быў вельмі своеасаблівы, нягледзячы на тое, што яны адчувалі ўплывы той дзяржавы, якая ўзвышалася ў пэўны момант гісторыі. Калі была адкрыта Амерыка і каравелы везлі золата ў Іспанію, яна ўзвысілася, і ўплыў іспанскага двара вельмі адчуваўся на ўсіх еўрапейскіх дварах. Калі касцюм двара польскага караля Жыгімонта другога Аўгуста быў выкананы ў змешаных стылях нямецкага і іспанскага, то ў Жыгімонта III Вазы быў ужо чыста іспанскі. А пазней пачынаецца экспансія французскага палацавага касцюма, усе двары яго пачынаюць пераймаць. Тым больш, што французскія манархі вельмі клапаціліся аб тым, каб іхняя мода пашыралася ў Еўропе: яны рассылалі лялек, якія былі апранутыя па ўзоры французскага двара. Усё гэта ішло і сюды.

Але ў XVI стагоддзі касцюм мясцовых вышэйшых колаў вельмі вылучаўся сярод іншых еўрапейскіх краін. Асабліва жаночы. Першая жонка Жыгімонта II Аўгуста Лізавета Аўстрыйская выглядала на гравюры так: берэт іспанскі, касцюм іспанскі, валасы адкрытыя, прыгожа ўкладзеныя. Другая жонка, знакамітая Барбара Радзівіл, апранутая паводле мясцовых законаў. Яна спачатку павязвала палатняную хустку, паверх апранаўся чапец, які быў аздоблены вельмі дарагімі каштоўнымі камянямі і толькі потым берэт. Гэтую мясцовую асаблівасць адчула яе свякроўка, маці Жыгімонта Аўгуста Бона Сфорца, італьянка. Калі яна прыехала, каб стаць каралевай Польшчы, то прывезла з сабой італьянскую моду, архітэктараў, вучоных. На гравюры відаць, што ў яе на валасах сетка, прыгожая ўзбітая прычоска, на якую накладзены берэт з разразнымі берагамі. Калі яна прыехала са сваімі італьянкамі, яе вельмі непрыхільна сустрэла мясцовая шляхта. Бо тут быў такі непахісны закон, што замужняя жанчына не павінна была адкрываць валасы. Бона ў сталым узросце выглядала ўжо зусім па-іншаму, паводле мясцовай моды ў яе поўнасцю закрытыя валасы. Нідзе ў Еўропе такога не сустракалася, акрамя як у Вялікім княстве ды ў Рэчы Паспалітай.

Шмат могуць сказаць пра сярэднявечную моду гравюры ды партрэты. Напрыклад, выкарыстоўваліся асаблівыя рукавы — яны былі проста творамі мастацтва, багата аздобленыя камянямі. Іх рабілі спецыяльныя майстры, такія рукавы вельмі дорага каштавалі, іх проста прывязвалі да станіка. І каб лепш было прывязваць, рабілі наплечныя валікі, якія прыкрывалі месца сутыкнення. Гэтыя рукавы былі настолькі дарагія, што Барбара вельмі любіла, каб яе маляваці. Засталося шмат яе партрэтаў. На адным партрэце яна паказана з тымі ж рукавамі, што былі ў Лізаветы Аўстрыйскай, хоць ужо другі станік. Бачыце, нават для каралеўскай сям'і такія рукавы лічыліся каштоўнымі вырабамі. Барбара вельмі любіла свецкае жыццё. У яе было шмат адзення і вельмі дарагія ўпрыгажэнні.

— Ці многія маглі сабе дазволіць такую раскошу?

— Мода сюды ішла ад тых, хто бываў за мяжой. Дзеці магнатаў вучыліся ў Еўрапейскіх універсітэтах. Вельмі многа падарожнічалі. Адтуль прывозілі замежнае адзенне. Еўрапейскім модам у асноўным аддавалі перавагу магнаты і гараджане, якія ўважліва сачылі, як выглядае эліта. Шляхта вельмі доўга трымалася свайго свабоднага адзення. Але калі Бона Сфорца на пачатку XVI стагоддзя прывезла вялікі пасаг, то еўрапейская мода пашырылася сярод польскага двара і магнацкага асяроддзя. А ўжо праз 40 гадоў пасля прыезду Боны — як я прачытала ў адным дакументе, — бедную шляхцянку за даўгі выганяюць з фальварка, дзе яна гасцявала ў нейкай пані, і сярод вопісу ея адзення, якое выкідаюць з дому, сустракаецца сукня чырвоная і зялёная ў палоску, па-італьянску аздоблена, а трэцяя сукня вузкая, пад гарсэт зроблена. Мода вельмі хутка распаўсюджвалася, яна ад вярхоў ішла да нізу. Усё залежала ад матэрыяльных сродкаў. У тыя часы, калі не было прамысловасці, асноўнае багацце складала зямля, а зямлю ж не пакажаш. Заможнасць паказвалі і выхваляліся сваім адзеннем.

— Паводле кнігі «Мужчынскі касцюм» можна зразумець, што мужчыны таксама любілі моднічаць?

— Яшчэ з XVI стагоддзя мужчынскі касцюм быў багацейшы за жаночы. Таму што жанчын тады не дазвалялася вывозіць у свет. Яны сядзелі дома, не надта часта выязджалі. А ўжо калі пашырылася французская мода, французскія паводзіны, французская элегантнасць, тады жанчыны спачатку зраўняліся з мужчынамі па прыгажосці свайго касцюма, а потым перасягнулі іх. Моладзь, якая павучылася ў Еўропе, пабачыла шмат гарадоў, прызвычаілася да еўрапейскіх касцюмаў, везла іх сюды. Магнатэрыя Вялікага княства Літоўскага перайшла на еўрапейскі касцюм недзе за стагоддзе да таго, як гэта адбылося ў Расіі. Калі Пётр I палкамі ўводзіў яго, то тут не трэба было гэтага рабіць — усе самі ахапілі і прыгажосць, і зручнасць гэтай вопраткі, самі сталі яе насіць.

— А ў мужчынскім касцюме было нешта асаблівае, што выдавала б прыналежнасць чалавека да Вялікага княства Літоўскага?

— Наша шляхта здабывала ў асноўным і зброю, і касцюмы ў сутычках з ворагамі. У асноўным сваім багаццем здзіўляў касцюм усходні — сваімі тканінамі і прыгажосцю. Здабычай станавіліся строі крымскіх татараў, туркаў. І, безумоўна, прыходзіла сюды адзенне з Расіі. Быў вельмі пашыраны гандаль з Расіяй. Мытні былі, але ў XVI стагоддзі жаліліся, што мытні на мяжы стаяць, але ўсе ездзяць аб'язнымі шляхамі. Многа гатовага адзення ўвозілася з Расіі — жупаноў, аднарадак. Ці адбівалася падчас розных ваенных паходаў. Таму і сілуэт шляхецкі мае асаблівасць: ён заўсёды пашыраны да нізу — такая вопратка прыстасаваная для ўзброеных сутычак, яна супрацьпастаўлялася касцюму французскаму прыдворнаму. Калі Стэфан Баторый прывёз сюды свой двор, то прыйшло многа адзення праз Венгрыю. Але тыя ж кунтушы і ермакі зашпільваліся толькі да таліі і далей пашыраліся, каб зручна было ў любы момант ускочыць на каня. Тады была вельмі напружаная абстаноўка — у XVII стагоддзі, напрыклад, толькі 32 гады быў мір, астатнія гады ішлі войны, адбываліся сутычкі, былі пагрозы магутных суседзяў, якія не грэбавалі чужое прыдбаць сабе — землі, маёмасць, адзенне суседняй шляхты. Касцюм шляхты быў свабодны, прыстасаваны да розных нечаканасцяў, куды б ні выпраўляўся шляхціч, у яго заўсёды з сабою была зброя. Калі выязджалі з маёнтка, то апраналі прашытае ватай адзенне ці з устаўнымі жалезнымі пласцінамі, каб абараніць цела ў выпадку нападу.

— Цяпер дызайнеры дыктуюць колер сезона. А як выбіраўся колер у ранейшыя часы?

— Спецыяльныя ўказы выдаваліся, якому слою гараджан які колер можна насіць, каму нельга насіць шаўковую вопратку, ці іншую, каб было адразу бачна, хто ідзе насустрач. Першыя ўказы з'явіліся ў Францыі, яны забаранялі простаму саслоўю насіць пэўныя тканіны. Потым было некалькі загадаў Рышылье, які выступаў супраць выкарыстання дарагіх металаў і камянёў у адзенні, і пасля гэтага іх сталі замяняць лентамі, карункамі. І ў Польшчы таксама выдавалі каралеўскія загады. Але беларускія гараджане, як бачна па вопісах, мала звярталі на гэта ўвагу. Зразумела, у вопісы трапляла толькі дарагое адзенне. Тым не менш усё адзенне было з імпартных тканін мануфактурнага вырабу. Такім чынам паказвалі свой статус, каб мець давер, можна ўзяць нейкі крэдыт у кагосьці. Калі я чытаю ўспаміны пра XIX стагоддзе, то тады і яшчэ на пачатку XX стагоддзя, калі сустрэнешся на вуліцы з гараджанінам, можна было вызначыць яго сацыяльнае становішча.

— Адзенне дорага каштавала?

— Вельмі дорага. Пісалі, што касцюм складаў нават палову багацця. Тканіны былі настолькі дарагія і трывалыя, што вопратку перадавалі ў спадчыну. Нават Радзівіл, бацька Пане Каханку, раіў свайму брату: лепш хай табе пашыюць мясцовыя майстры, танней будзе, чым прывозіць з Францыі. Магнаты ў асноўным задавальняліся тым, што ім прывозілі адзенне з Францыі. Напрыклад, касцюм Аляксандра Астрожскага, сына Уладзіслава Дамініка Астрожскага — у Францыі гэты касцюм з'явіўся ў 1670-х гадах. Астрожскі памёр у 1674-м, гэта значыць, што ён насіў самы модны касцюм на той час. Той жа модны колер, тыя ж упрыгажэнні — усё прывозілася.

На імпартных узорах вучыліся мясцовыя майстры. Хапала майстэрства ўбачыць і тут жа зрабіць такое самому, і гэта карысталася попытам. Моладзь, як і ў цяперашні час, чула адгукалася на хістанні моды, а больш сталыя людзі з узростам пераходзілі на свой шляхецкі, больш звыклы касцюм. Калі паглядзець на партрэт маладога Януша Радзівіла, калі той быў кашталянам, то ён напісаны мастаком у французскім палацавым касцюме.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

КЛЁВА!



Практыка

ПОШУК ШЧУПАКА

Працэс пошуку шчупака не будзе такім працяглым і стамляльным, калі вы ловіце вудачкай на жыўца не першы год і ўжо ведаеце ўчасткі на вадаёмах, дзе драпежнік пастаянна спыняецца на зімовыя стаянкі.

Цяжэй, зразумела, шукаць шчупака на невядомым вадаёме. Але калі вы ўпэўнены, што ён тут ёсць, то для пачатку трэба паспрабаваць візуальна вызначыць такія месцы. Значна цяжэй гэта зрабіць на вялікіх вадаёмах, дзе канцэнтрацыя драпежніка не пастаянная. І ўсё ж спачатку трэба паспрабаваць лоўлю каля берага і каля астраўкоў расліннасці, якія маюцца побач, у рэчышчах рэчак, якія ўпадаюць у вадаём ці ў іх саміх. Калі прытрымлівацца сцвярджэння, што шчупак абавязаны стаяць у такіх месцах, вы свідруеце лункі ўздоўж берага і травы, а таксама робіце кантрольныя лункі на некаторым аддаленні ад берага, каб вызначыць перапад глыбінь.

На глыбокіх азёрах раніцай шчупак трымаецца бліжэй да берагоў, але да абеду вяртаецца на глыбіню. Выхад яго на водмелі пад вечар будзе залежаць ад надвор'я і працягласці светлавога дня. Выхад яго да берагоў пачынаецца яшчэ да світання, у чым неаднаразова маглі пераканацца аматары лоўлі на зімовыя жарліцы, якія пакідалі снасці на ноч.

Пошук шчупака ў рацэ некалькі прасцейшы. Па рэльефе берагоў нескладана вызначыць наяўнасць ямаў і віроў, водмеляў, зонаў з наяўнасцю карчоў. Перспектыўныя месцы блізкага суседства каля вады дрэў і кустоў, уваходы ў старыцы і затокі, выхады да ракі каналаў і ручаёў, берагавых крыніц. На ямах лункі пачынаюць свідраваць ад берага з выдаленнем на глыбіню. Спрабуюць лавіць сярод карчоў у вадзе паблізу ад ямы або на выхадзе з яе.

Поспех пошуку ў асноўным будзе залежаць ад надвор'я ў дзень лоўлі. Калі яно не адпавядае параметрам лоўлі і шчупак «стаў на прыкол», то знайсці яго будзе даволі цяжка. Вы можаце прасвідраваць лункі на месцы стаянкі, не ведаючы гэтага, але адсутнасць рыбнай актыўнасці прымусіць вас пакінуць перспектыўную зону, да якой вы, магчыма, не вернецеся і потым. Таму пошукамі шчупака трэба займацца тады, калі надвор'е спрыяе для таго, каб рыба бралася.

Святло ад лунак, хутчэй за ўсё, прывабліве драпежніка, але стаіць ён за светлай плямай у цёмнай зоне. Каля такіх лунак, асабліва ў сярэдзіне зімы, у шчупака ёсць магчымасць выкарыстоўваць у пэўнай ступені і зрок. Да светлавой зоны лункі пачынае падыходзіць рыбная драбяза, што часта і прывабліве шчупака дадаткова. У цёплыя дні з нізкім ціскам шчупак можа падымацца да лёду ці стаяць упаўвады, таму пры лоўлі, асабліва ў час абеду, трэба абавязкова спрабаваць лавіць і ў верхніх слаях вады. Калі вы знайшлі шчупака ў пэўным месцы, дакладней, ён бярэцца на адной з лунак, можна паспрабаваць прасвідраваць дадатковыя лункі на гэтай глыбіні. На чыстых і эканалагічна спрыяльных азёрах весці пошук шчупака будзе прасцей, калі вы, хоць бы прыблізна, ведаеце размяшчэнне падводных паясоў расліннасці, броўкі, перапады глыбінь, звалы і іншыя месцы з вялікай колькасцю рыбы.

(Працяг будзе.)

Парады бывалых

МАЗЬ АД ХОЛАДУ

Каб зменшыць уздзеянне холаду, можна выкарыстоўваць спецыяльную мазь. Вось яе рэцэпт: 150—200 грамаў салёнага сала пакласці ў бляшанку і разагрэць на пліце ці ў духоўцы, дадаць 15—20 грамаў вазеліну і добра перамяшаць. Калі маса астыне, перакласці яе ў скрыначку. На лёдзе гэтай маззю змазваюць рукі і лёску.

Я. МАРОЗ.

Майстэрня

ЗІМОВАЯ ЖАРЛІЦА

Прапаноўваю простую ў вырабе зімовую жарліцу, якая складаецца з драўлянай стойкі таўшчынёй 15 і даўжынёй 300—350 міліметраў і сігналізатара. На стойцы размяшчаецца матавільца ці катушка. Сігналізатар мацуецца ізаляцыйнай стужкай або адрэзкам гумавага шланга, які падыходзіць па дыяметры.

Для стварэння сігналізатара бяру кашулю ад матацыклетнага тросіка, які прыйшоў у непрыгоднасць. Гэта спружына, пакрытая пластмасавай абалонкай. Апошнюю неабходна зрэзаць нажом. Далей са спружыны раблю адрэзкі даўжынёй па 100—120 міліметраў. У спружыну з аднаго боку ўстаўляю кавалак дроту дыяметрам 0,8—1 і даўжынёй 150—200 міліметраў і абціскаю пласкагубцамі або запайваю. Другі канец дроту згінаю, на яго надзяваю кембрык або адрэзак даволі папулярнай у стварэнні рознага кшталту самаробак медыцынскай кропельніцы.



Сцяжок раблю з тканіны тыпу «балоння» чырвонага або чорнага колеру і мацую яго да сігналізатара клеем. На матавільца намотваю 10—15 метраў лёскі 0,3—0,5. Пры ўстаноўцы трэба пятлю з лёскі зафіксаваць адрэзкам трубкі, як паказана на малюнку. Калі жарліца выкарыстоўваецца без катушкі, трэба пасля фіксацыі спуску змотаць з матавільца 3—4 метры лёскі і пакласці яе на лёд кольцамі, інакш драпежнік, адчуўшы супраціўленне, кіне жыўца. Кольцы пажадана пакласці на сухі лёд, каб лёска не прымерзла. Калі рыба будзе брацца, сігналізатар вызваліцца і прыме вертыкальнае становішча. Лунку ў марознае надвор'е пажадана засыпаць амаль да сігналізатара сухім снегам.

Зімовая жарліца ў рабочым становішчы. 1—стойка, 2—спружына, 3—дрот, 4—сцяжок, 5—адрэзак пластыкавай трубачкі, 6—матавільца.

Г. СТАРАЖЫЛАЎ.

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

Кручкі не будуць ржавець, калі ў скрыначку, дзе яны захоўваюцца, насыпаць крыху крухмалу.

Каб лунка не замярзала, *трэба насыпаць у яе жменю пасечанага сена ці сухой травы. Яны пакрываюць паверхню вады і перашкаджаюць замярзанню. Да таго ж набухлыя часніцы сена апускаюцца на дно і прывабліваюць рыбу.*

У воблачнае, пахмурнае надвор'е, у непразрыстай вадзе, на вялікай глыбіні, на досвітку, бліжэй да вечара і ў прыцемках **шчупака і акуня трэба лавіць на светлыя блешні.** У яснае, сонечнае надвор'е, днём і ў светлай вадзе — на цёмныя. На глыбіні больш за чатыры метры патрэбны цяжкія блешні, на мелкаводдзі — лёгкія.

Вопытныя рыбаловы лічаць, ***што шчупак бярэцца часцей,*** *калі рухі блешні плаўныя, а паўза на ніжнім узроўні гульні будзе больш працяглай.* ***Акунь аддае перавагу*** *кароткім, рэзкім кідкам блешні з непрацяглым на ніжнім узроўні.*

З жыўцоў **толькі залаты карасік не засынае пры доўгай транспарціроўцы.** Перавозіць яго трэба ў карзіне загорнутым у сыры мох — тут ён даўжэй застаецца жывым, чым у посудзе з вадой.

Рыбалоўныя снасці, прынады і рукі вудзільшчыка ***заўсёды павінны быць чыстымі.*** *Трэба запомніць, што да рэчываў, якія выклікаюць адварочванне ў рыбаў, адносяцца машыннае масла, бензін, мазі ад камароў, тытунь, а таксама свежыя фарбы, адэкалон.*

Каб вочы не стамляліся ад назірання за лёскай і старажком на фоне белага снегу і лепш было бачна іх размяшчэнне, рассцяліце непасрэдна за лункай невялікі кавалак тоўстай цёмнай тканіны, мешкавіны і прыцісніце яго крошкамі лёду. Стане лепш бачна, калі рыба будзе брацца.

КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск №2 (570)

аддзел рэкламы 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Прад

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 15. Нічыя. (4+4).



Заданне № 16. Нічыя. (4+5).



Час на абдумванне рашэння эцюдаў — тры тыдні з дня апублікавання заданняў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Змяшчаем рашэнні кампазіцый, апублікаваных у снежні 2007 года.

№ 9. 1. Ла1! Крh7 2. Ла8; 1. ... Кр:h5 2. Крf5.

№ 10. 1. Кс1! ~~ 2. Кd3+, 1. ... Кр:d4 2. С:d6, 1. ... Крf4 2. Кd3+, 1. ... d5 2. Крe3.

№ 11. Фс1! цугцванг. 1. ... Крa4 2. Се2 Крa5 3. Фс6! 2. ... Крb3 Сс4+, 1. ... Крa2 2. Фс2+ Крa3 3. Сd1, 2. ... Крa1 3. Сg6.

№ 12. 1. Крс7! ~~ 2.Кс4+ Кр:d5 3. Кe3 (d6)+, 1. ... Кf3 2. Ф:e7+ Крf4 3. Кg2+, 1. ... Лс2 2. Кg7+ Крd4 3. Кe6+, 1. ... d2 2. Кg3+ Крd4 3. Кe2+.

Адказы на гэтыя заданні даслалі наступныя ўдзельнікі конкурсу: Віктар Быкаў і Сяргей Гурыновіч (Мінск), Алег Бадзюкоў (Круглянскі раён), Юрый Бандарэнка (Магілёў), Іван Козел (Мазырскі раён), Анатоль Прынеслік (Віцебск), Генадзь Мігаль (Кобрын), Алег Чарневіч (Барань), Пётр Шчамялёў (Бялыніцкі раён) і іншыя.

ВЫЙШЛА Ў СВЕТ

Аматары шахматнай кампазіцыі маюць магчымасць атрымаць «Залатую кнігу шахматнай кампазіцыі», у якую ўвайшлі творы кампазіцыі за 1850—1913 гг. Заяўкі на гэтую кнігу трэба дасылаць на адрас: 624440, Россия, Свердловская обл., Краснотурьинск, ул. Базстроевская, д. 14, кв. 2, Есаулковой Зинаиде Дмитриевне. Кошт з улікам перасылкі — 400 расійскіх рублёў.

Захапленні

Калекцыянер

Старшы адміністратар жлобінскага хакейнага клуба «Металург» Дзмітрый Мельнік устанавіў своеасаблівы спартыўны рэкорд. У калекцыі 37-гадовага мінчаніна звыш паўтары тысячы шайбаў. Набыць увесь яго скарб мараць многія аматары гульні для сапраўдных мужчын, і за гэта яны гатовы аддаць любыя грошы. Аднак Дзмітрый не хоча развітвацца са сваім багаццем, бо збіраў сваю калекцыю на працягу гадоў і ўклаў у яе ўсе свае сілы і душу.

У калекцыі Дзмітрыя Мельніка столькі многа шайбаў, што яго варта ўнесці ў Кнігу рэкордаў Гінеса.

Знаходка Курта Фрэйзера

Збіраць хакейныя шайбы Дзмітрый пачаў у дзевяцігадовым узросце. Праўда, тады рабіў гэта несвядома. Заядлым жа калекцыянерам ён стаў дзесяць гадоў таму. Быў перыяд, калі на нейкі час яму давялося забыцца аб сваім хобі, у прыватнасці, калі служыў у арміі. Дарэчы, як высветлілася, менавіта служба і звязала майго суразмоўцу са «Звяздой». Дзмітрый прызнаўся, што яго аднаго з усёй дывізіі, а служыў ён у Полацку, адпраўлялі ў Мінску ў рэдакцыю нашай газеты ў час падпісной кампаніі даставіць нейкія дакументы. «Я бываў у вас настолькі шмат, што ведаю ўсе калідоры», — заўважыў Дзмітрый.

На маё пытанне, адкуль жа з'явілася жаданне збіраць менавіта хакейныя шайбы, Дзмітрый паведаміў гісторыю з уласнага дзяцінства:

— Першую шайбу я набыў яшчэ да таго, як стаў займацца хакеем, — распавядае ён. — Купіў я яе ў спартыўным магазіне Мінска за 33 капейкі. Маці тады сказала, што лепей было б набыць нешта больш карыснае, а не такую дробязь. Захоўваю жа яе збіраць шайбы вядомы ў мінулым хакеіст Сяргей Шыткоўскі, гэта бацька іграка мінскага «Юнацтва» Сяргея Шыткоўскага.

У збіранні хакейных шайбаў Дзмітрый пераўзышоў свайго ідэйнага натхняльніка: калі яго калекцыя налічвала каля 300 экзэмпляраў, то на сёння скарб нашага героя складае звыш 1500 шайбаў. 900 з іх выстаўлена ў клубе «Металург».

— Спачатку жонка не надта разумела маё захапленне, — кажа калекцыянер. — Калі ж я частку шайбаў перанёс з дому ў клуб, яна мне нават заявіла, што пасля гэтага не адчувае сябе ў роднай кватэры як дома.

У своеасаблівы музей шайбаў у офіс «Металурга» наведваюцца аматары беларускага і замежнага хакея, спецыялісты. Неяк туды зазірнуў і галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Курт Фрэйзер, які адшукаў там кавалачак сваёй хакейнай кар'еры — шайбу каманды правінцыі Антарыо 1977 года. Заакіянскі спецыяліст быў прыемна здзіўлены такой знаходцы. Не так даўно ў Жлобін прыязджалі чэхі і пабачылі ў калекцыі сувенірную шайбу, прымеркаваную да 50-годдзя хакея іх невялічкага горада. У іх саміх такога экзэмпляра не было! Сам жа ўладальнік калекцыі ганарыцца зусім іншымі сваімі экспанатамі:

— Безумоўна самая дарагая для мяне першая шайба, — сцвярджае Дзмітрый. — Я вылучыў бы з усіх астатніх яшчэ і шайбу з мінулага чэмпіянату свету ў Маскве. Хоць яна не пабывала ў варотах, але гэтай шайбай гулялі ў фінале. Каштоўнасць маюць для мяне алімпійскія шайбы, пачынаючы з 1976 года, і шайбы са спаборніцтваў на прызы «Известий» з 1972 па 1991год і шайба з Кубка Канады-1976.

Дзмітрый чамусьці не вылучыў канкрэтна шайбу з Алімпіяды ў Солт-Лейк-Сіці — тую самую, якая ўляцела ў вароты шведаў і прынесла нашай зборнай самую гучную перамогу ў гісторыі беларускага хакея. «Дзе такая самая шайба на самай справе? У мітусні, што тады пачалася на лёдзе, — тлумачыць калекцыянер, — яна, хутчэй за ўсё, знікла. Ведаеце, у хакеі існуе прымета выкідваць такія кур'ёзныя шайбы, якія закінулі ў твае вароты, каб такога больш не было. Можа, шведы так і зрабілі, ці яе забраў сам аўтар кідка. Валодзя Копаць на гэта мае поўнае права, бо такая перамога адбываецца ў кар'еры, можа, толькі раз».

Шайбы, якім няма кошту

Якім шляхам папаўняецца калекцыя Дзмітрыя? Напалову яна скамплектаваная з падарункаў сяброў (хакеістаў, урачоў, трэнераў і г. д.), а астатнюю частку давялося купляць у іншых калекцыянераў. «Зразумела, што магчымасць набываць каштоўныя шайбы ў мяне з'явілася не адразу, — узгадвае Дзмітрый. — Часам мне даводзіцца купляць не толькі тыя шайбы, якія мяне зацікавілі, але і ўсю калекцыю. Напрыклад, калі адзін масквіч не зграбаўся прадаць 40 шайбаў, а толькі ўсе 300. Так мая калекцыя і павялічваецца». Шайбу з фіналу чэмпіянату свету-2007 прывёз беларускі арбітр Іван Дзядзюля, які абслугоўваў галоўны матч. Пастаўкі бацьку робіць і 15-гадовы сын Багдан.

Такую багатую калекцыю, безумоўна, хацеў бы мець любы аматар хакея. Дзмітрыю не раз прапаноўвалі выкупіць яго скарб, але ён не згаджаецца.

— Вядома ж, я прадаваў некаторыя шайбы, але каб усе? — не можа сабе такога ўявіць калекцыянер. — Адзін вядомы мінскі бізнэсмен неяк сказаў мне: «Зараз перавозім усе твае шайбы да мяне, а дадому ты едзеш на маім «Хамеры». Я пажартаваў, што згадзіўся б, калі да аўто ў прыдачу мне падаравалі б і сваю запраўку, але адмовіўся. Я не магу развітацца са сваёй калекцыяй, бо па ёй можна вывучаць гісторыю хакея, гэта — мая душа.

На шчасце, нейкіх інцыдэнтаў абрабавання калекцыі Мельніка пакуль не ўзнікала, ды і хакейны скарб знаходзіцца пад наглядам супрацоўнікаў аховы, якія, даведаўшыся аб існаванні ў іх горадзе такога калекцыянера-рэкардсмена, адразу прапанавалі яму свае паслугі.

— Такіх маштабных калекцый, наколькі я ведаю, у Беларусі больш няма, — перакананы суразмоўца. — Ёсць у Канадзе, Амерыцы. Спрабуе стварыць свой музей федэрацыя хакея Беларусі (у ім каля 50 шайбаў), але іх больш цікавіць сучасны хакей, асабліва шайбы з чэмпіянатаў свету, а мяне ўсе — клубныя, з дзіцячых камандаў...

«Вайна» з сынам перарасла ў яго кар'еру

Дзмітрый сам калісьці быў хакеістам, потым стаў суддзёй, быў начальнікам каманды мінскага «Дынама», стаяў ля вытокаў яе стварэння, а потым прыняў прапанову пераехаць са сталіцы ў Жлобін. «Я стаміўся ад Мінска, — расказвае ён. — Калі праязджаў праз Жлобін на цягніку (ехаў у Гомель судзіць матч), гэты горад мяне заўжды цікавіў, бываў тут, калі гуляў у хакей. Таму я адразу згадзіўся на прапанову працаваць у «Металургу», які, лічу, сёння — самы дынамічна развіты клуб».

Бацька захапіў хакеем і свайго сына Багдана. Спачатку юнак трэніраваўся ў школе «Юнацтва», потым — у спецыялізаваній дзіцячай школе алімпійскага рэзерву, якой кіруе Анатоль Іванавіч Бяляеў, а пазней па абмене перабраўся ў Ніжнякамск. «На трэніроўку я адвёў сына ў 8 гадоў, і да 13-гадовага ўзросту ў нас была вайна, бо яго больш цікавіў камп'ютар, гулянне на вуліцы, — дзеліцца ўспамінамі Дзмітрый, — але цяпер сын не ўяўляе свайго жыцця без хакея. Яго патрэбна было проста падштурхнуць, зацікавіць. Я ў дзяцінстве таксама быў такім».

Ірына ПРЫМАК.
Фота прадастаўлена прэс-службай ХК «Металург».

УСЛЕД ЗА ЖЫЛІБЕРАМ

Факт

У мінулым годзе заснавальнік знакамітага батанічнага саду і першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі медыцынскай акадэміі Жан Эмануэль Жылібер быццам вярнуўся ў Гродна — бронзавай скульптурай Уладзіміра Панцялеева на ўваходзе ў гарадскі парк.

Гэта быў першы ў горадзе над Нёманам твор з вельмі папулярнага ў Еўропе жанру малой паркавай скульптуры. І працяг будзе. Гродзенскі гарвыканкам аб'явіў конкурс на распрацоўку эскізнага праекта дэкаратыўнай скульптуры (скульптурнай кампазіцыі) з наступным вырабам для размяшчэння на ўчастку скрыжавання вуліц Савецкай і Ажэшкі ля будынка ЗАГС адміністрацыі Ленінскага раёна. Да ўдзелу ў конкурсе запрасілі спецыялістаў з мастацкай і архітэктурнай адукацыяй, маючых вопыт творчай дзейнасці. Конкурсныя прапановы прымаюцца ўпрыўленнем архітэктуры і горадабудаўніцтва да 18 лютага 2008 года.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПРЫГАЖОСЦЬ ПА-ПАНСКУ І ЗРУЧНАСЦЬ ПА-СЯЛЯНСКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

А калі ён стаў гетманам Вялікага княства Літоўскага, і яго конніца лічылася нават лепшай у Еўропе, то ён ужо стаіць з падбрытым чубам, у звыклым жупане, падпаясаны слуцкім поясам. Знакаміты Пане Каханку, вярнуўшыся ў Нясвіж, ужо ніколі не апранаў еўрапейскі касцюм, хадзіў у тым, у чым хадзілі тут, нават насіў адзенне ў псеўдасялянскім стылі, казаў, што сялянскае адзенне больш зручнае, чым панскае. Ён быў вельмі своеасаблівы, яркі чалавек, які меў сродкі гаварыць і дыктаваць сваю моду.

— Ці адрозніваліся па модзе мясцовыя балі ад еўрапейскіх?

— Можна было бачыць усё тое самае. Кажуць, што антычную моду на лёгкія празрыстыя сукенкі прывезла каханка Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Гэтая мода хутка пашырылася тут і ў Расіі. Хоць пісалі, што нашы паненкі мруць як мухі ад гэтага — ніякае футра не магло захаваць ад холаду, калі дзяўчына была ў тоненькіх шоўкавых пантофліках і ў такой сукенцы, хоць і апраналі яны трыко пад ніз, усё роўна гэта не ратавала. Трэба сказаць, што ўсё адаптавалася да нашых умоў. Напрыклад, больш сталыя жанчыны не насілі празрыстае, таксама ў іх былі тунікападобныя сукенкі з поясам пад грудзямі, але з цяжкіх, не празрыстых тканін. Калі дзяўчаты напаміналі сабой грачанак, то больш сталыя жанчыны паходзілі на рымскіх матрон сваімі формамі і сваім адзеннем. Французскай моды ва ўсіх дэталях прытрымліваліся толькі некаторыя нават з магнацкага асяроддзя. Яна паступова адаптавалася больш нізкімі слаямі і выходзячы з тых сродкаў, якія яны мелі.

— Сялянскі касцюм, здаецца, быў больш кансерватыўны, амаль не мяняўся. Але ўсё роўна строі перадаваліся ў спадчыну, нібыта каштоўнасць.

— Сялянскі касцюм захоўваўся стагоддзямі. У першай кнізе ёсць ілюстрацыя — адбітак на кафлі з выявай ганчара. А ёсць фатаздымак ганчара пачатку XX стагоддзя — на ім такая ж выява. Тая ж прычоска, такое ж адзенне. Нічога не змянілася. Для гэтых людзей шляхта была недзе там, у яе было сваё жыццё, у селяніна сваё. Сын паўтараў шлях бацькі, унук паўтараў шлях дзеда. Адзенне было прыстасаванае да мясцовых умоў. Яно падыходзіла да сялянскай працы. Навошта было мяняць тыя ж лапці, калі зімой у іх падкладалі сена — і было цёпла? Навошта было іх мяняць летам, калі можна накруціць на ногі пад лапці анучкі і ісці на балота? Вада вылівалася, нага высыхала, не прэла, таму што ануча была з палатна. Нават у 60—70-ыя гады мінулага стагоддзя сустракаліся старыя, якія ішлі касіць і апраналі лапці, таму што вельмі зручна ў іх хадзіць па балоце. Такі абутак быў вельмі прыстасаваны да мясцовых умоў, таму ён праіснаваў тысячы гадоў. Пакуль не з'явіўся больш зручны. Зразумела, калі селянін бачыў на гаспадары боты, то таксама хацеў сабе справіць такія. Яны былі вялікага памеру — туды можна было салому напіхаць і анучку закруціць. Імі карысталася некалькі пакаленняў сялянскай сям'і...

Жанчыны самі ткалі, пралі, шылі сабе адзенне, і кожная жанчына старалася схаваць нейкія недахопы, паказаць сябе з найлепшага боку, каб касцюм быў ёй да твару. У сялянскім асяроддзі не было актыўных сувязяў міжнацыянальных, міжрэгіянальных, усе традыцыі кансерваваліся. Калі пачалі развівацца гарады, то іх уплыў стаў пашырацца на прылеглую тэрыторыю. Гэта адразу можна было заўважыць у прычосках — зніклі наміткі, таму што яны былі нязручныя. Жанчыны імкнуліся падкрэсліць свой твар, а калі на галаве прыгожая хустка, то і твар становіцца прыгажэйшым. Таму сталі моднымі па-рознаму завязаныя хусткі з розных тканін.

Я з дзяцінства памятаю хустку, якую мой дзядуля прывёз бабулі з першай сусветнай вайны: яна была белая шаўковая, танюткая з ціснёным узорам. Бабка мне яе паказвала — шоўк ужо пажоўк, а яна яе так і не разу не апранула! Берагла. Гэта быў такі дарагі падарунак. Дзед меў тры Георгіі, не меў толькі чацвёртага, залатога. Яму вельмі многа плацілі тады. На ўвесь павет такіх было два ці тры чалавекі. Яму была паложана спецыяльная пенсія. Вось ён купіў і прывёз гэтую хустку. Такая была прыгажосць! Я вельмі любіла залезці да бабы ў куфар, дзе захоўваліся каштоўныя для яе рэчы. Там ляжаў абрус, які яна выткала яшчэ як была ў дзеўках — васьмінітовы, прыгожы, было ўражанне, што ён не тканы, а фабрычнага вырабу, з найтанчэйшага кужэльнага лёну вытканы. Бабуля прасіла яго ёй у труну пакласці... Там была вышытая сарочка, быў яе андарак, вышытыя фартухі. Я любіла раскладваць гэтыя рэчы — ад іх ішла цеплыня і любоў.

Вокладкі новых кніг Валянціны БЯЛЯВІНАЙ і Любові РАКАВАЙ.

Касцюм дзяўчыны-сялянкі. *Карціна Карусецкага «Вербная нядзеля». 1847 г.*

Сукенка па іспанска-нямецкай модзе. *Партрэт Барбары Радзівіл. Невядомы мастак.1548 г.*

Шляхецкі касцюм з жупаном і дэлія́й. *Партрэт Мікалая Завішы. Невядомы мастак. Сярэдзіна XVII ст.*

— Можа таму вы вырашылі звярнуцца да тэмы касцюмаў на Беларусі?

— Я 40 гадоў працую ў Інстытуце мастацтвазнаўства Акадэміі навук, за гэты час давялося займацца рознымі тэмамі. Чатыры гады мы з Любоўю Васільеўнай Ракавай працавалі над тэмай мужчынскага касцюма. І калі мы звярнуліся з нашым матэрыялам у выдавецтва «Беларусь», нам прапанавалі сабраць матэрыял і на другую кніжку — пра жаночы касцюм. Любоў Ракава займалася традыцыйным жаночым касцюмам. І я, калі працавала па мужчынскім гарадскім касцюме, то рабіла выпіскі і па жаночым. За год мы завяршылі працу — другая кніга «Жаночы касцюм на Беларусі» выйшла тыражом у тры тысячы экзэмпляраў. Справа ў тым, што кніга «Мужчынскі касцюм на Беларусі» была выдадзена тыражом у дзве тысячы экзэмпляраў, і ён амаль увесь разышоўся, што мяне вельмі здзівіла: гэта ж не мастацкая літаратура, ды і на беларускай мове! На выставе ў Маскве гэтая кніга атрымала дыплом трэцяй ступені сярод усіх рэспублік. Расіяне сказалі, каб яна была на рускай мове, то яна б выдатна пайшла і ў іх, таму што па касцюму ў іх нічога падобнага не рабілася...

Ларыса ЦІМОШЫК.

Усміхнёмся!

— Дарагі, навошта ты хаваеш кнігі? Думаеш, госці могуць іх украсці?

— Глупства, вядома ж, не! Але могуць іх пазнаць.

☺

Сабака напаў на Джэніфер Лопес і адкусіў у яе паўмільёна.

☺

Дзве суседкі на дачы.

— Маша, а ты чаму пудзіла ў агарод не ставіш?

— А навошта? Я сама цэлы дзень у агародзе...

☺

Пытанне армянскаму радыё:
— Што можа быць лепш за першую шлюбную ноч?
— Першая пазашлюбная!

☺

— Таня, ну калі ты перастанеш быць такой раўнівай?

— Ты зноў назваў мяне Таняй?!

☺

У дзень, калі на Ісаака Ньютана звалiўся яблык, ён запатэнтаваў закон сусветнага прыцягнення, яблычнае пюрэ і некалькі лаянак.

Цяпло халоднага снегу

Быў месяц сакавік. Яшчэ з зімовым марозцам і снегам, але з вясновымі сонейкам і доўгімі сінімі цянямі. Снег тады выпаў як апошні, глыбокі ды сонечны, слянпіў вочы, чысцюткі ды мяккі, вясновы. Вандроўка занесла ў вёску Пачапава баранавіцкага мастака Анатоля, краязнаўцу ды прадпрымальніка Васіля, патрыётаў гэтага краю, маіх маладых сяброў, і мяне з імі. Не шукаючы сцежак, мы з радасцю тапталі сонечную неруш, пакідаўшы ў машыне шапкі ды шалікі, узіраліся ў краявіды, нечым падобныя да малюнкаў Напалеона Орды, які тут бываў-маляваў, праз навалы снегу прабіліся да рэчкі Сэрвяч і там дзівіліся з таго, як ціха-мірна вясна шапталася з зімою ў падмытых празрыстаю водою берагах, на бялюткім астраўку сярод цёмнай вады, у сонечным, паўз бераг, алешніку, як жывапісна доўгія сінія пасы ад вольхаў ляжалі ад берага да берага, быццам паклаўшы свой мост паміж порамі года.

З Пачапава ў Баранавічы вярталіся пры агнях, бо там, у вёсцы, Васіль Васільевіч нас частаваў яшчэ таксама жывапісным знаёмствам з вясковым бацюшкам айцом Георгіем у мясцовым Свята-Пакроўскім храме. Храм быў Васілю як свой дом, бо быў, разбураны ў ліхалецце, адноўлены двума Васілямі, бацькам ды сынам Філіпчыкамі, якія гэтую добрую справу зладзілі разам з айцом Георгіем ды вясковым тутэйшым людам. З таго шчаслівага падарожжа хоць я і трапіў у бальніцу, гэта не азмрочыла вандроўкі з добрымі людзьмі. Пнеўманія мінулася, а светлая радасць ад пражытага дня засталася і чакала яго працягу.

І вось — зноў тут, у Баранавічах. Зноў побач Васіль ды Анатоль, зноў падарожжа, але ўжо не на колах — па светлых залах, дзе з усіх бакоў па сценах карціны ды карціны Анатоля Лабкоўскага. Яшчэ з той паездкі сюды я ведаў, што Анатоль Уладзіміравіч піша алеем, але не здагадваўся, што гэта вельмі сур'ёзнае захапленне. Цяпер убачыў: мала сказаць — захапленне. Гэта — жыццё ў жывапісе.

Ён мне прызнаўся перад адкрыццём выставы: «Хвалююся. Тут мая першая ў жыцці выстава. Ды ў сваім родным горадзе. Тут усе мяне ведаюць...»

Бачыў карціны і людзей. Адны глядзелі на карціны задумліва, другія — весялей, з усмешкай. І гэтакі стаяў перад пейзажам я. Усміхаўся, бо радаваўся сустрэчы са знаёмым мне матывам. Гэта ж быў той дзень, снежны ды сонечны, тая Сэрвяч, тыя вольхі, той самы астравок белага снегу на ільдзіне пасярод рэчкі і праз яе, праз астравок — сінія цені. Іх пазнаваў і думаў: якія моцныя дзы светлыя адчуванні таго дня былі ў памяці мастака, калі ён далёка не ў тым дні, далёка ад таго пейзажу, у горадзе, у майстэрні, пісаў той дзень, ужо як успамін. І не ў тым вартасць, дакладна ці не дакладна выпісаў дзень у малюнку, колерах, а ў тым, як моцна, выразна, свежа захаваў у сабе тое вясновае ў зімовым дні святло, тую вясновую раскошу, тон, цяплынь халоднага снегу, дыханне першых дзён вясны, якую Бялыніцкі-Біруля называў вясною святла. Уражваў і матыў суседняга пейзажа: той самы светлы дзень, снег, адна, як сірата, хаціна ў снезе, ад яе бліскі ў снезе трактарок, снегам накрыты, хляўчук пад снегам і дрэўца, адно, падпашкі ў снезе. Пейзажык паспеў забыцца, але цяпер ураскрэс у вачах жыўцом. Ад рэчкі мы тады ішлі да машыны, і той, здавалася, малапрыкметны ў прасторы святла і снегу сялянскі дварок быў ад нас далёка, яго я заў-важыў, выпадкова кінуўшы ў тым напрамку вокам. Як сеў у машыну — на яго забыўся. Але ў маладога мастака вока вастрэйшае. І памяць, і адчуванні чэпкія. Мінуўся час — пейзажык свяціўся на палатне. Цяпер і я ўбачыў: там быў усё ж жывапісны вобраз, нават не ў хатцы, дрэве, трактары і снезе паасобку, а ў вясновым, пад сонцам, руху жывой, снегам закіданай, прыроды, жыцця зямлі, якая спала і прачнулася, бы мядзведзь, цяпер той лапічак жыцця як бы вылузваўся з-пад снегу, ужо чуў сваю вясновую раллю, яе красу і прагу, хоць і яна яшчэ хавалася пад снегам. Быў новы дзень і ён усіх і ўсё будзіў, будзіў і чалавека — хоць і мяне, — які стаяў зімой у зале, глядзеў пейзажык мастака. Пейзаж будзіў.

Мастак Анатоль ЛАБКОЎСКІ і яго карціна «Рыжы дворык».

Свежыя, непасрэдныя ўражанні жылі ў «Любчанскай навальніцы», «Шчары», «Навагрудскіне» ды іншых пейзажах. У кожным быў свой настрой, падобны на той, што ад першага, самага шчырага і шчодрага бачання, адкрыцця свету. Тут маладое пачуццё, нічым не азмрочанае. Адсюль энергія пластычных формаў і ліній, упэўненасць кампазіцыі, смеласць і святланоснасць мазка. Гэтакімі глядзяцца навагрудскія палеткі, падобныя да цёплых, з пячнога жару-духу, хлябоў, якія ў годным зацішку атуляваюць малую вёсачку, крытую сонечнымі, як скальпы з неба, дахамі. Гэтакія і берагі Шчары, што берагуць рэчку, дзе рэчка — люстра неба, у якой яно само тут, на зямлі, яго краса ды чысціня. А курганы ў «Любчанскай навальніцы» быццам у лазні перад святам. Яшчэ з-пад хмараў шугае дождж, а зямля ўжо сонечная, цяплом пануе, блішчыць, зэзе памытая. Іншы настрой — «Самота»: ноч, прыпудраная сярбрам ды залацізною, высока ў небе свеціць месяц, пад ім пірамідальныя таполі, велічнастромыя, абсыпаныя тым самым янтарна-залацістым святлом, падобныя і да васковых, нібы на алтары ў храме, свечак, а пад імі начная вусцішная рэчка з адбіткамі ў ёй таполяў-свечак — залоцяцца дарожкі. Прыгожа. Уся прыгажосць — у настроі, пачуцці. Глядзіш як быццам не сваё — сваё ўспамінаеш і сябе, душу сваю, чытаеш. А гэтым мастак звярнуў увагу прысутных сяброў на тое, што выставіў работы, напісаныя толькі за адзін апошні год, аднаў іх толькі часам нараджэння, як папярэджваў магчымае здзіўленне, што яны розныя і жанрам, і настроямі, і ў выбары тэхнічных сродкаў, ёсць работы пачатыя, але не даведзеныя да апошняга мазочка, ёсць спробы стварыць сваю ікону («Замілаванне», «Марыя»), а ёсць у натуральным выглядзе жаночыя фігуры. І папярэджваў, і тлумачыў: ён так жыве і так працуе, яму сумна пісаць натуру, якую ўжо пісаў, сумна сябе ў нечым паўтараць, пісаць у адным настроі, у адным жанры, у кожную работу хоча ўкласці свежы настрой, нават і нечаканы, дзіўны, свой тэмперамент.

— Пішу і раптам адчуваю, што ў душы жар-пыл патух, што кроў астыла. Тады здымаю палатно з мальберта і стаўлю новае, пачынаю пісаць тое, што ў гэты час хвалюе. Адсюль шмат незавершаных работ. Як з імі быць? Не ведаю і сам.

Мастак адкрыты, па-маладому шчодры: цікава паглядзець, як працую — калі ласка. Ён не хаваецца.

Што ўрэшце?

Сустрэча з мастаком Анатолем Лабкоўскім была ўсім святам. Адбылося галоўнае: першае знаёмства з яго мастацтвам не расчаравала, парадавала, а сяброў, прыхільнікаў яго творчасці, прыбавілася. Першы вернісаж абяцае новыя сустрэчы.

Віктар КАРАМАЗАЎ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.12	16.30	8.18
Віцебск —	8.08	16.13	8.05
Магілёў —	8.03	16.20	8.17
Гомель —	7.53	16.23	8.30
Гродна —	8.26	16.46	8.20
Брэст —	8.20	16.53	8.33

Месяц

Поўня 15.35
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Піліпа, Пятра, Яўстрата;*
К. *Анастасіі, Вікторыі, Віктара, Вінцэнта, Дамініка, Мацея.*

НАДВОР'Е на заўтра



— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

Геамагнітныя ўзрушэнні

2 гадз.	5 гадз.	8 гадз.	11 гадз.	14 гадз.	17 гадз.	20 гадз.	23 гадз.

...у суседзяў

ВАРШАВА -1..+1°С	**КІЕЎ** 0..+2°С	**РЫГА** +1..+3°С
ВІЛЬНЮС -1..+1°С	**МАСКВА** -4..-2°С	**С.-ПЕЦЯРБУРГ** -2..0°С

Дзве даты

22 студзеня

1863 год — 145 гадоў таму ў Варшаве быў выдадзены Маніфест Цэнтральнага нацыянальнага камітэта, які аб'явіў аб пачатку нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы, Беларусі і Літве. Падрыхтоўкай паўстання на Беларусі і Літве кіраваў Літоўскі правінцыйны камітэт на чале з Кастусём Каліноўскім.

1905 год — расстрэл царскімі войскамі мірнай дэманстрацыі рабочых у Пецярбургу (Крывавая нядзеля, 9 студзеня па ст. стылі). Было забіта каля 1000 чалавек і паранена больш як 2 тысячы.

Цытата дня:

«Усе пашаны гэтага свету не вартыя аднаго добрага сябра».

Вальтэр (1694—1778), французскі пісьменнік, філосаф-асветнік.

ПАРКУЙЦЕСЯ ПРАВІЛЬНА!

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя распачала татальнае «паляванне» на парушальнікаў правілаў паркоўкі.

Як паведаміла начальнік аддзела агітацыі і прапаганды ўпраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Жана Тройна, асабліва пільная ўвага будзе скіравана на цэнтральную частку горада. У прыватнасці, пад жорсткім кантролем «даішнікаў» акажуцца вуліцы Кірава, Камсамольская, Валадарскага, Леніна, Энгельса, Інтэрнацыянальная, Раманаўская Слабада, Мельнікайтэ, Нямiга. Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі будуць бязлітасна караць парушальнікаў на месцы. А ў выпадках, калі кіроўцы не будзе побач з аўтамабілем, які замінае руху астатняга транспарту, машыну эвакуіруюць на штрафстаянку. У такім выпадку гаспадару «жалезнага каня» давядзецца заплаціць не толькі за няправільную паркоўку, але і за знаходжанне аўтамабіля на штрафстаянцы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 35.018. Індэкс 63850. Зак. № 351. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12